Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 СТУДЗЕНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 19 (29899)

«РЫСЯНЯТЫ» КОЛЕРУ ХАКІ 5

СУСВЕТНЫ ПАРАЛІМПІЙСКІ РУХ МНОГАЕ СТРАЦІЎ 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:

«На сёння мы бачым, што кароткатэрміновы эфект ад увядзення санкцый вычарпаны і пік высокай інфляцыі пройдзены. Назіраецца ўстойлівае зніжэнне індэкса спажывецкіх цэн і трэндавай інфляцыі. Паводле нашых ацэнак, адназначных велічынь гадавая інфляцыя дасягне ўжо да канца першага квартала 2023 года. Сёлета ўрадам і Нацыянальным банкам пастаўлена задача па яе запаволенні да ўзроўню 7-8 працэнтаў. Сумеснымі намаганнямі важна максімальна абмежаваць уплыў праінфляцыйных фактараў. Тым больш што пры адсутнасці новых шокаў інфляцыйнае асяроддзе стане больш спрыяльным. У многім зніжэнню інтэнсіўнасці гэтых працэсаў будзе садзейнічаць работа па аптымізацыі затрат і паскораным імпартазамяшчэнні, якая праводзіцца прадпрыемствамі. Таму спрыяе нармалізацыя інфляцыйных працэсаў у Расіі, прымальны ўзровень цэн на імпартуемыя энерганосьбіты, а таксама стабілізацыя кошту сыравінных тавараў на сусветных рынках».

Кампетэнцыі і тэхналогіі

Фота БелТА.

Цэнтр кампетэнцый сучасных тэхналогій на базе Гомельскага аўтамеханічнага каледжа аснасцілі найноўшым абсталяваннем. Усяго па машынабудаўнічым профілі ў краіне працуюць тры такія цэнтры: у Мінску, Оршы і Гомелі. Профільны цэнтр кампетэнцый у Гомелі створаны ў рамках дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка». Гомельскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж стаў асновай для яго рэалізацыі. Для цэнтра было пастаўлена абсталяванне апошняга пакалення. Яго выкарыстанне дазваляе вучням на належным узроўні ўдзельнічаць у конкурсе прафесійнага майстэрства па стандартах WorldSkills па кампетэнцыі «Такарныя работы на станках з праграмным кіраваннем», «Фрэзерныя работы на станках з праграмным кіраваннем».

На здымку: навучэнец каледжа Андрэй СУВОРАЎ на новым абсталяванні асвойвае прынцып работы разрыўнога стэнда.

КАРОТКА

• **Стартаваў прыём заявак на конкурс «Інтэрнэт-прэмія ТІБА».**

• Батанічны сад запрашае на інтэрактыўны практыкум «Расліны для хатняй утульнасці». Ён пройдзе 3, 4 і 5 лютага а 14-й гадзіне.

ISSN 1990 — 763X

Актуальнае інтэрв'ю

Аляксей БЯГУН:

«ГРАМАДЗЯНСТВА ТРЭБА ЗАСЛУЖЫЦЬ»

Хто мае права беларусам звацца і якія дзеянні прыводзяць да страты грамадзянства?

Ці кожны ахвотны можа атрымаць беларускі пашпарт, што ўяўляе сабой працэдура набыцця грамадзянства і пры якіх умовах можна яго страціць, карэспандэнту «Звязды» расказаў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Аляксей БЯГУН. Кіраўнік падраздзялення таксама падзяліўся, як супрацоўнікі органаў унутраных спраў дапамагаюць перасяленцам з Украіны, ідуць у нагу з высокімі тэхналогіямі і трымаюць пад кантролем незаконную міграцыю.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

Формула энергапаратунку жылля

Капрамонт + цепламадэрнізацыя = амаль новы будынак

Фота Ірыны СІДАРОК.

Сёлета камунальнікі плануюць капітальна адрамантаваць у Беларусі 1108 дамоў, або 3,7 млн м², з якіх 1,1 мільёна «квадратаў» — у сталіцы. Найбліжэйшыя ў капрамонтнай чарзе зараз будынкі, узведзеныя ў канцы 60-х — 70-я гады мінулага стагоддзя. 27 шматкватэрных дамоў у краіне са згоды і з фінансавым удзелам жыхароў атрымалі не толькі капрамонт, але і цепламадэрнізацыю. Пра некаторыя асаблівасці і праблемы капрамонту расказалі спецыялісты.

СТАР. 6

Далёкая блізкая Афрыка

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з дзяржаўным візітам у Зімбабвэ. Гэта найвышэйшы пратакольны статус візіту

Самалёт кіраўніка дзяржавы зрабіў пасадку ў аэрапорце сталічнага горада Хараре ўчора ў другой палове дня. Беларускага лідара сустракаў асабіста прэзідэнт краіны Эмерсан Мнангагва.

Рота ганаровай варты, гімны дзвюх краін, залпы з салютных установак — усё па вышэйшым разрадзе, як і належыць у адпаведнасці з пратаколам пры дзяржаўным візіце. Але было шмат і нацыянальнага каларыту. Мясцовая традыцыя — на прэзідэнтаў надзелі гірлянды з жывых кветак. А песні і танцы пад барабанную музыку адразу акунулі ў атмасферу Афрыканскага кантынента.

У аэрапорт таксама прыехала шмат мясцовых жыхароў — прыхільнікаў лідара краіны Эмерсана Мнангагвы, якія жыва віталі кіраўнікоў дзяржаў.

Аляксандр Лукашэнка і Эмерсан Мнангагва паехалі на адным аўтамабілі, на якім устаноўлены прэзідэнцкія штандары. У праграме двухбаковых зносін на найвышэйшым узроўні ўчора была нефармальная вячэра.

Беларуская дэлегацыя пачала работу ў Харарэ яшчэ да гэтага. У першай палове дня прайшоў беларуска-зімбабвійскі бізнес-форум, дзе ўжо заключаны шэраг двухбаковых дакументаў. Дзелавыя сустрэчы і перагаворы прадоўжацца і ў дні візіту.

Афіцыйная частка перагавораў Аляксандра Лукашэнкі і Эмерсана Мнангагвы запланавана на сёння. Кіраўнікі дзяржаў сустрэнуцца ў фармаце сам-насам і ў пашыраным складзе — з удзелам членаў дэлегацый з абодвух бакоў.

З удзелам лідараў краін таксама пройдзе цырымонія перадачы тэхнікі беларускіх вытворцаў у рамках завяршэння другой фазы праграмы па механізацыі фермерскіх гаспадарак Рэспублікі Зімбабвэ і старт трэцяй фазы праграмы. Мерапрыемства пройдзе на базе Інстытута сельскай гаспадаркі Зімбабвэ.

ВУЧОНЫЯ І ЖУРНАЛІСТЫ: ПРАФЕСІЙНЫ ТАНДЭМ

Учора ў Нацыянальнай акадэміі навук былі ўшанаваны пераможцы конкурсу на найлепшае прадстаўленне навуковых дасягненняў 2022 года ў сродках масавай інфармацыі. У намінацыі «Найлепшая публікацыя» прэмію конкурсу атрымала рэдактар аддзела газеты «Звязда» Надзея НІКАЛАЕВА.

Конкурс праводзіўся трынаццаты раз па чатырох намінацыях: «Найлепшая публікацыя», «Найлепшы сюжэт (праграма) на радыё і тэлебачанні», «Найлепшая публікацыя ў навукова-папулярным выданні» і «Найлепшае прадстаўленне дасягненняў НАН Беларусі ў сетцы Інтэрнэт».

На кожнай з намінацый прысуджаны тры прэміі. У конкурсе маглі прымаць удзел як прафесійныя журналісты, так і непрафесійныя аўтары, папулярызатары навукі. Усяго было прадстаўлена 126 работ 38 аўтараў.

— Для таго каб данесці да грамадскасці вынікі работы нашых вучоных, надзвычай актуальна працаваць з журналістамі, мы гэта цудоўна разумеем. Дзякуй усім, хто прапагандуе беларускую навуку, і вялікая просьба да вас — працягвайце гэта рабіць, — падкрэсліў падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджвання прадстаўнікоў СМІ **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Грамадству трэба ведаць, чым жыве беларуская навука. Менавіта на яе папулярызацыю і была скіравана маштабная выстаўка «Беларусь інтэлектуальная», арганізаваная па даручэнні кіраўніка дзяржавы напярэдадні Дня беларускай навукі. Там былі прадстаўлены найбольш значныя распрацоўкі за апошні перыяд. Выстаўку атрымала шырокі рэзананс, у тым ліку дзякуючы СМІ, станоўчыя водгукі, і цяпер яна будзе праходзіць у рэгіёнах. Напэўна, першым абласным цэнтрам, які падхопіць эстафету, будзе Гомель. Мы і раней праводзілі навуковыя выстаўкі, але такая маштабная, міжведамасная і дэталёва прадуманая з кластарнай арганізацыяй выстаўка прайшла ў нас упершыню.

Уладзімір Гусакоў уручыў таксама дыпломы пераможцаў конкурсу «100 маладых талентаў НАН Беларусі» і конкурсу «Топ-10 вынікаў дзейнасці акадэмічных вучоных». Штогадовы конкурс «100 маладых талентаў НАН» быў заснаваны ў 2018 годзе. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца кандыдаты навук ва ўзросце да 30 гадоў і дактары навук ва ўзросце да 40 гадоў, якія працуюць у арганізацыях НАН Беларусі. Агульная колькасць маладых вучоных, якія адначасова ўваходзяць у банк даных «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», не можа перавышаць 100 чалавек, а штогадовая колькасць лаўрэатаў конкурсу — не большая за 20 чалавек. У гэтым годзе ў банк увайшлі загадчык аддзела навукова-інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук Аляксандр Бараноўскі, навуковы супрацоўнік лабараторыі аптычнай спектраскапіі паўправадніковУ НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па матэрыялазнаўстве, кандыдат фізіка-матэматычных навук Вольга Барадаўчанка і старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі малекулярнай біятэхналогіі Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Ілья Казлоўскі.

Уладзімір Гусакоў асабліва адзначыў актуальнасць амаладжэння навуковага саставу акадэміі і выказаў пажаданне, каб маладыя даследчыкі больш актыўна абаранялі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Што датычыцца топа дасягненняў акадэмічных вучоных у галіне фундаментальнай і прыкладной навукі, то, як падкрэсліў Уладзімір Гусакоў, патрабаванні да прэтэндэнтаў (да навізны і актуальнасці заяўленых вынікаў) прад'яўляюцца вельмі жорсткія. «Мы не спяшаліся з вызначэннем пераможцаў, каб не памыліцца, — падкрэсліў ён. — У выніку было прынятае рашэнне адзначыць восем, сярод якіх і вучоныя і аўтарскіх калектывы».

Ул. інфармацыя.

Парламенцкі дзённік

СВЕТАПОГЛЯДНЫ І ЮРЫДЫЧНЫ ЗМЕСТ

Савет Рэспублікі адобрыў законапраекты аб УНС і дзейнасці палітычных аб'яднанняў

Падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання парламентарыямі былі адобраны законапраекты, датычныя асноў грамадзянскай супольнасці, дзейнасці палітычных і грамадскіх аб'яднанняў, а таксама Усебеларускага народнага сходу.

Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА скіравала ўвагу на тое, што праект Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» шмат абмяркоўваўся з насельніцтвам у розных рэгіёнах краіны:

— Такая форма народаўладдзя, як УНС, існуе толькі ў нас, у Беларусі. Яна зарэкамендавала сябе даволі даўно — было праведзена ўжо шэсць УНС. Але цяпер, прымаючы законапраект, мы надаём УНС статус дзяржаўнага органа — найвышэйшага органа народаўладдзя. Члены Савета Рэспублікі актыўна ўключаліся ў распрацоўку, мы разглядалі праект закона на пасяджэнні экспертнага савета, абмяркоўвалі законапраект з нашымі людзьмі ў розных рэгіёнах Беларусі. Тыя падзеі, якія мы бачым, даюць зразумець: свет вельмі неспакойны. І для таго каб наша краіна развівалася і жыла паводле суверэнных ды незалежных законаў, вядома, у нас павінен быць орган улады, які дазволіць у крытычныя моманты прымаць важныя і сур'ёзныя для нашай краіны і нашага народа рашэнні.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Алег ДЗЯЧЭНКА адзначыў, што праект «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў» накіраваны не толькі на развіццё грамадскай супольнасці, але і на стымуляванне дзейнасці палітычных партый:

— Плануецца, што ў кожнай вобласці павінна быць не менш за 100 членаў партыі, прадстаўніцтвы будуць стварацца не менш чым у адной трэці абласцей і раёнаў, уключаючы горад Мінск. Павялічваецца партыйная колькасць да 5000 членаў — гэта вельмі важна. Нам неабходна выключыць з такога працэсу партыі, якія налічваюць усяго некалькі дзясяткаў чалавек і не прадстаўляюць інтарэсы народа Беларусі. Таму змяненні будуць накіраваны на тое, каб сёння партыі больш актыўна працавалі з грамадзянскім сектарам, давалі магчымасці нашым грамадзянам рэалізаваць свае палітычныя правы і, у тым ліку, браць удзел у выбарчым працэсе.

Алег Дзячэнка дадаў, што важным новаўвядзеннем стане тое, што членамі партый могуць быць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў. Таксама забараняецца фінансаванне палітычных партый і аб'яднанняў з замежных крыніц, паколькі замежнае фінансаванне можа паўплываць на ўнутрыпалітычныя працэсы, адзначыў сенатар. У той жа час дапускаецца фінансаванне палітычных партый з боку асобных грамадзян і фізічных асоб, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь: сума ахвяравання не павінна перавышаць 1000 базавых велічынь у год.

Член Савета Рэспублікі, старшыня РГА «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ, каментуючы праект Закона «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», адзначыў, што ён змяшчае як светапоглядны, так і юрыдычны аспекты:

— Светапоглядны аспект вельмі важны. Справа ў тым, што грамадзянская супольнасць у палітычнай навуцы часта ўспрымаецца як апанент дзяржаве. А бывае і як сіла, якая знаходзіцца ў жорсткім супрацьстаянні з дзяржавай. Наш закон устанаўлівае зусім іншыя прынцыпы ўзаемадзення дзяржавы і грамадзянскай супольнасці. Гэта не апаненты і тым больш не ворагі: дзяржава і грамадзянская супольнасць — саюзнікі ў вырашэнні значных грамадскіх праблем. І задача грамадзянскай супольнасці заключаецца ў тым, каб дапамагаць дзяржаве і беларускаму народу вырашаць значныя сацыяльныя праблемы і рухацца па шляху ўзыходзячага прагрэсіўнага развіцця.

Алег Раманаў падкрэсліў, што прававы аспект законапраекта вызначаецца глыбокай выверанасцю:

— Дадзена дакладнае вызначэнне паняцця «грамадзянская супольнасць», вызначаны суб'екты грамадзянскай супольнасці і механізмы рэалізацыі дзейнасці.

Таксама падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сёмага склікання ў ходзе галасавання быў выбраны намеснік старшыні Савета Рэспублікі. Ім стаў Валерый Бельскі, няўдаўна прызначаны членам Савета Рэспублікі кіраўніком дзяржавы. Па выніках таемнага галасавання сенатары аднагалосна падтрымалі яго кандыдатуру.

Больш падрабязна аб прынятых законапраектах чытайце ў заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пётр Павел перамог на выбарах прэзідэнта Чэхіі



Былы старшыня ваеннага камітэта НАТА Пётр Павел атрымаў перамогу ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў у Чэхіі, паведаміла агенцтва EFE. Прэм'ер-міністр Чэхіі Пётр Фіяла пацвердзіў на прэс-канферэнцыі перамогу Павела на выбарах прэзідэнта краіны. Кіраўнік урада разлічвае на актыўнае і плённае супрацоўніцтва з новым кіраўніком дзяржавы. Як паведаміла інфармацыйнае агенцтва СТК са спасылкай на Чэшскае статыстычнае ўпраўленне, Павел перамог з 58,32 % галасоў выбаршчыкаў пасля падліку галасоў з выбарчых участкаў. Яго сапернік экс-прэм'ер Чэхіі Андрэй Бабіш заручыўся галасамі 41,67 % выбаршчыкаў. Бабіш з'яўляецца лідарам цэнтрысцкага палітычнага руху ANO і цяпер узначальвае апазіцыю ў парламенце. Яўка склала 70,25 % ад агульнай колькасці з 8,25 млн выбаршчыкаў краіны з насельніцтвам каля 10,6 млн грамадзян. Як вядома, у Чэхіі прэзідэнт валодае ў асноўным цырыманіяльнымі функцыямі, аднак менавіта ён прызначае прэм'ера і членаў Цэнтральнага банка, а таксама прапануе кандыдатуры суддзяў у Канстытуцыйны суд.

Пасольства ЗША ў Анкары папярэдзіла аб верагоднасці тэрактаў у Стамбуле



Пасольства ЗША ў Анкары выпусціла ў панядзелак абноўленае прадпісанне амерыканскім грамадзянам быць пільнымі ў сувязі з верагоднасцю тэрактаў у Турцыі. Папярэджанне размешчана на сайце пасольства, паведаміла ТАСС. «Урад ЗША папярэджвае сваіх грамадзян аб верагодных і непазбежных зваротных нападах тэрарыстаў на цэрквы, сінагогі і дыпмісіі ў Стамбуле або іншых месцах, якія часта наведваюць жыхары заходніх краін. У прыватнасці, гэта раёны [Стамбула] Бееглу, Галата, Таксім іІсцікляль», — паведаміла пасольства. Дыпмісія зазначае, што гэтае паведамленне «абнаўляе папярэджанне ад 27 студзеня 2023 года, датычнае інцыдэнтаў са спальваннем Карана ў Еўропе». Тады пасольствы ЗША і Францыі папярэджвалі аб магчымых тэрактах супраць іншаземцаў у Турцыі.

Паліцыя паведаміла аб затрыманні больш чым 700 пратэстоўцаў у Гаазе

Паліцыя Нідэрландаў затрымала ў Гаазе больш чым 700 удзельнікаў акцыі супраць выдзялення ўрадам субсідый на здабычу нафты, газу і вугалю. Пра гэта стала вядома з распаўсюджанага ў «Твітэры» паведамлення, перадае ТАСС. Раней Rtl Nieuws пісала, што экалагічныя актывісты з групы Extinction Rebellion арганізавалі пратэст супраць субсідый вытворцам выкапнёвага паліва ў Гаазе з удзелам прыкладна 1,2 тысячы чалавек, пасля чаго паліцыя пачала эвакуіраваць пратэстоўцаў. Паводле даных Metro, экаактывісты перакрылі трасу A12, хоць мясцовыя ўлады забаранілі дадзеную акцыю, і прымацаваліся спецыяльнай канструкцыяй адзін да аднаго, арганізаваўшы пасля сядзячую забастоўку. Адзначаецца, што супрацоўнікі паліцыі папрасілі актывістаў разысціся і знайсці іншую пляцоўку для дэманстрацыі, аднак гэтая просьба была праігнаравана, пасля чаго пачаліся затрыманні.

Падчас выбуху ў мячэці ў Пакістане загінула каля паўсотні чалавек

Па меншай меры, 47 чалавек загінулі і яшчэ каля 150 пацярпелі ў выніку выбуху ў пакістанскім горадзе Пешавар, паведаміла «Бі-бі-сі». У мясцовай паліцыі паведамілі, што на месцы здарэння былі знойдзены сляды ўзрыўчаткі. Пакуль дакладна невядома, ці была гэта бомба, закладзеная ў будынку, альбо выбух учыніў тэрарыст-смяротнік. У выніку здарэння частка будынка абрынулася, многія людзі апынуліся пад завалами.

Інклюзіўная адукацыя

Асобны кабінет для кожнага педагога

Пасля рэканструкцыі Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання ў Брэсце павялічыўся ў тры разы

Брэсцкаму абласному цэнтру карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі сёлета спаўняецца трыццаць гадоў. Да юбілею ўстанова атрымала важкі падарунак — цалкам абноўлены корпус і, адпаведна, магчымасць дапамагаць значна большай колькасці дзяцей.

— Мы практычна адкрылі новы сучасны аб'ект, — сказаў **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК.** — У ходзе капітальнага рамонту будынак не толькі цалкам абноўлены, удалося дасягнуць галоўнага — павялічыць яго плошчу ў тры разы. Цяпер яна складае каля тысячы квадратных метраў. На гэта пайшло каля двух мільёнаў рублёў сродкаў з абласнога бюджэту. Але ж затраты таго вартыя. З'явілася магчымасць павялічыць штат супрацоўнікаў, адпаведна, вырасце колькасць дзяцей, якіх зможа прыняць цэнтр.

Дырэктар цэнтра Таццяна ЖУК расказала, што да рэканструкцыі карэкцыйна-педагагічную падтрымку тут атрымлівала ўсяго 30 хлопчыкаў і дзяўчынак, сёння ўжо займаецца 53 дзіцяці, і колькасць будзе расці. «Дзеці, якія патрабуюць асаблівай увагі і асаблівай дапамогі, атрымліваюць яе», — падкрэсліла дырэктар. Акрамя таго, у цэнтры штогод праходзіць псіхолага-педагагічнае абследаванне больш за 300 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Больш як 600 хлопчыкаў і дзяўчынак з вобласці атрымлівае кансультацыі.

Ва ўстанове з'явіўся шэраг новых кабінетаў. Напрыклад, кабінет дыягностыкі аснашчаны па самых сучасных патрабаваннях. Для кабінета рухальнай актыўнасці набыта новае абсталяванне, ёсць дзве сэнсарныя залы: цёмная і светлая. З'явілася пад'ёмная платформа вертыкальнага перамяшчэння для інвалідаў.

Шматгадовыя напрацоўкі ўстановы паспрыялі адкрыццю рэсурснага цэнтра па інклюзіўнай адукацыі. Асноўнымі мэтамі цэнтра, паводле слоў **намесніка дырэктара Галіны БУСЬКО,** становяцца максімальнае ўключэнне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў соцыум, а таксама фарміраванне інклюзіўнай культуры ва ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, і ў выніку — стварэнне інклюзіўнага грамадства. Цэнтр пастаянна праводзіць інклюзіўныя фестывалі, ладзіць выставы творчых работ сваіх выхаванцаў і іншыя мерапрыемствы.

З улікам названых фактараў і праводзілася рэканструкцыя. Спецыялісты ААТ «Брэстжылпраект» і ААТ «Палессежылбуд» улічылі пажаданні супрацоўнікаў цэнтра. Пры правядзенні аддзелачных работ выкарысталі колеравую гаму, якую хацелі бачыць педагогі.

Што выглядае важным, цяпер у кожнага педагога ёсць асобны кабінет. Апошняе дае магчымасць праводзіць не толькі індывідуальныя заняткі, але і заняткі з невялікімі групамі выхаванцаў. У цэнтры працуе дзіцячы ўрач-псіхіятр, хутка з'явяцца яшчэ некалькі супрацоўнікаў медыцынскага профілю.

Яшчэ адзін набытак, які адзначаюць педагогі, — неабходны дыдактычны матэрыял, развіццёвыя дапаможнікі. Якасць работы спецыялістаў ужо ацанілі і дзеці, і дарослыя. Мама выхаванкі Ала Андрановіч падзякавала і будаўнікам, і работнікам цэнтра: «Сучасныя дзеці павінны займацца ў сучасных умовах, і нашым дзецям яны тут забяспечаны».

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Марына ВАСЬКО, якая прыйшла павіншаваць калектыў цэнтра з навасэллем, адзначыла, што капітальны рамонт і рэканструкцыя ўстановы не з'яўляюцца выпадковай падзеяй: «Гэта вынік сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы з улікам падыходаў, якія рэгламентуе Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дзе шмат увагі ўдзелена інклюзіўнаму кірунку».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Надвор'е

Снег і мяцеліца, але...

на гэтым тыдні ўдзень усё роўна з плюсам

Вось і наступіў апошні месяц зімы, час суровых маразоў і завей. На гэтым тыдні нас чакаюць снег, галалёдзіца і начныя маразы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у сераду і чацвер кіраваць надвор'ем у нашай краіне будуць франтальныя раздзелы, якія працягнуць прыносіць усё новыя порцыі ападкаў у выглядзе снегу і мокрага снегу.

У першы дзень лютага на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, днём — снегу з дажджом. У асобных раёнах слабая мяцеліца, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Удзень месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 0 — мінус 6 градусаў. Днём будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

У чацвер часам прагназуецца снег, мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе ў межах ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

У ноч на пятніцу ў Беларусі яшчэ захаваецца ўплыў атмасферных франтоў, і ападкі ў выглядзе снегу будуць адзначацца ў большасці раёнаў краіны. У светлы час сутак стыхія супакоіцца, але стане халадней. Днём фон атмасфернага ціску пачне расці і снег пройдзе толькі месцамі па краіне. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. З паўночна-заходнімі патокамі на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць больш халодная паветраная маса. Тэмпературны фон панізіцца, і ў начныя гадзіны падмарозіць да мінус 1—8 градусаў, а ўдзень слупкі тэрмометраў пакажуць 0—5 марозу.

І ў суботу месцамі па краіне чакаецца снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Ўначы тэмпература будзе 3—10 марозу, пры ўмове працяглых праясненняў месцамі паветра астудзіцца да мінус 11—13 градусаў. Днём прагназуецца ад мінус 6 градусаў да аднаго цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, уначы да заходніх граніц нашай краіны наблізіцца чарговая сістэма атмасферных франтоў. Раніцай і днём іх уплыў распаўсюдзіцца на большасць раёнаў Беларусі. Таму ноччу месцамі па захадзе, а раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 градусаў ніжэй за нуль, пры праясненнях да 14 марозу. Днём тэмпература будзе вагацца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Назаруку Ігару Васільевічу, намесніку міністра замежных спраў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Інавацыі

ЗУБНЫЯ ІМПЛАНТЫ: ІНДЫВІДУАЛЬНЫ НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

Навукоўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта распрацавалі механіка-матэматычную 3D-мадэль ніжняй сківіцы чалавека для правільнай установкі імплантаў. Імплантацыйнае лячэнне пацыентаў у цяперашні час з'яўляецца распаўсюджаным і самым эфектыўным спосабам аднаўлення зубнога раду.

Імплант змяшчаецца ў костку сківіцы ў вобласць, дзе раней размяшчаўся корань зуба. Далей ідзе перыяд астэаінтэграцыі, ці зрошчвання, які можа доўжыцца да пяці месяцаў. У гэты момант верагоднае адаравanne. Магчымыя наступныя ўскладненні, звязаныя са стратай апорнай здольнасці імпланта. Адной з прычын гэтых праблем з'яўляецца яго некарэктнае размяшчэнне.

Навукоўцы БДУ стварылі механіка-матэматычную 3D-мадэль, якая дазваляе разлічыць дакладнае геаметрычнае размяшчэнне імплантаў з улікам індывідуальных асаблівасцяў пацыента. Гэта спрыяе скарачэнню тэрмінаў лячэння дзякуючы папярэдняму ацэньванню магчымай рэакцыі зубоў на нагрузку.

Для стварэння індывідуальнай мадэлі спачатку робіцца тамаграфічны здымак сківіцы, далей у спецыяльным дадатку для апрацоўкі медыцынскіх малюнкаў 3DSlicer яна праектуецца. Для правядзення вылічальнага эксперымента ўлічваюцца гранічныя ўмовы для сківіцы канкрэтнага чалавека. Гэта дзеянне мышачных сіл і фізіялагічная жавальная нагрузка. Яе велічыня залежыць ад асаблівасцяў прыкусу і цвёрдасці прадуктаў харчавання. Вынікі разліку прадстаўляюцца ў выглядзе дыяграмы, на якой выдзелены вобласці з больш высокім механічным напружаннем і дэфармацыямі.

З дапамогай 3D-мадэлі ўрачы могуць аказваць кансультацыйныя і навукова-тэхнічныя паслугі. Таксама распрацоўка можа быць скарыстана для планавання хірургічных аперацый.

Работа над стварэннем 3D-мадэлі вядзецца з 2020 года. На дадзены момант распрацоўка знаходзіцца на этапе правядзення доследаў.

Праект выконваюць аспірант механіка-матэматычнага факультэта БДУ Дзмітрый Назаранка і дэкан Сяргей Басякоў. Запыт на колькаснае рашэнне задач па ўстаноўцы імплантаў паступіў ад супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Акрамя таго, вучоныя-медыкі праводзілі кансультацыйнае суправаджэнне распрацоўкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Запрашальнік

Сезон актыўнага адпачынку пачынаецца з выставы

З 23 да 26 лютага ў Мінску пройдзе міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства — 2023». Арганізатарам выступае Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа». Выстава праводзіцца пры падтрымцы і ўдзеле Міністэрства лясной гаспадаркі, УП «Белдзяржпаляванне» і Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

У рамках праграмы плануецца правядзенне семінараў, прэзентацый і конкурсаў вытворцаў і пастаўшчыкоў тавараў, чэмпіянату вабільшчыкаў аленя, продаж прадукцыі з мяса дзікіх жывёл.

У перыяд работы выставы будзе праведзена другая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Сучасныя праблемы паляўніцтвазнаўства і захавання біяразнастайнасці», якая прысвечана дваццаціпяцігоддзю ўтварэння УП «Белдзяржпаляванне». Падрабязную інфармацыю па ўмовах удзелу ў канферэнцыі можна знайсці на сайце прадпрыемства.

Сёлета выстава суправаджаецца шырокай праграмай: на адкрытай пляцоўцы будзе арганізавана палявая кухня і пройдуць майстар-класы па гатаванні страў з рыбы; на кірмашы фермераў наведвальнікам прапануюць разнастайныя прадукты ўласнай вытворчасці; адбудзецца дэманстрацыя навінак рыбалоўных прылад, майстар-класы па рыбнай лоўлі пройдуць у спецыяльна ўстаноўленых басейнах; будуць праведзены конкурсы і віктарыны з прызамі і падарункамі на стэндах удзельнікаў; наведвальнікаў чакаюць штодзённыя розыгрышы прызоў ад арганізатара выставы.

Таксама ў рамках праграмы плануюцца: дэманстрацыя вопратак для палявання і рыбалкі; конкурс дзіцячага малюнка на тэму рыбалкі; рэгістрацыя паляўнічых сабак; кансультацыі кінолага; паказ пародаў паляўнічых сабак; заключэнне дагавораў на паляўнічыя туры; выстава паляўнічых трафеяў; конкурс «Найлепшы паляўнічы трафей года»; продаж пасадачнага матэрыялу.

Экспаненты выставы прапануюць паляўнічыя і рыбалоўныя тавары, паслугі па арганізацыі актыўнага адпачынку, рыбалоўныя і паляўнічыя туры, турыстычныя і спартыўныя тавары, грыбы, ягады, мёд, а таксама спецыяльную літаратуру.

Удзельнікі змогуць пазнаёміць сваю мэтавую аўдыторыю з уласным брэндам і навінкамі, усталяваць дзелавыя кантакты і назіраць рух рынку.

Уваход вольны. Час работы: 23—25 лютага — 10.00—19.00, 26 лютага — 10.00—18.00

Больш падрабязную інфармацыю можна даведацца на афіцыйным сайце арганізатара — Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БелЭкспа».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Рэкордная колькасць замежнікаў летась атрымала беларускія пашпарты. Пераважная частка з іх — украінцы. Чарговы ўказ быў падпісаны ў канцы года: нашымі суайчыннікамі сталі яшчэ 220 чалавек з 18 краін, у тым ліку 27 непаўналетніх. Усяго за перыяд выканання даручэння кіраўніка дзяржавы, дадзенага падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», якая адбылася 9 жніўня 2021 года, грамадзянства Рэспублікі Беларусь атрымалі 7317 замежнікаў і асоб без грамадзянства, у тым ліку 5491 украінец.

«ГРАМАДЗЯНСТВА ТРЭБА ЗАСЛУЖЫЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Аляксей Юр'евіч, грамадзяне Украіны працягваюць прыбываць у Беларусь. Наша дружалюбная краіна не толькі становіцца для іх прытулкам, дзе яны часова хаваюцца ад вайны. Многія ўкраінцы, як і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, хочуць назаўсёды застацца ў Беларусі. Каму вы дапамагаеце набыць беларускае грамадзянства, а значыць, і Радзіму?

— Кожны дзень мы падпісваем дазволы аб наданні грамадзянам Украіны статусу дадатковай абароны. Летась аб гэтым хадайнічала рэкордная колькасць асоб. Прычым рост у параўнанні з папярэднім годам касмічны. На тэрыторыі Беларусі знаходзяцца грамадзяне розных дзяржаў, якія таксама маюць патрэбу ў міжнародным абароне: Афганістана, Емена, Ірака, Сірыі, іншых краін. Што датычыцца грамадзян Украіны, усе з іх атрымліваюць на тэрыторыі Беларусі дадатковую абарону тэрмінам на год. Некаторыя з тых украінцаў, хто прыбыў да нас яшчэ ў першую хвалю эміграцыі ў 2014 годзе, па-ранейшаму знаходзяцца на дадатковай абароне: калі ў краіне грамадзянскай прыналежнасці назіраецца нестабільнасць грамадска-палітычнай сістэмы, ідуць баявыя дзеянні, то тэрмін дадатковай абароны працягваецца. Большасць украінскіх грамадзян, якія прыбылі ў Беларусь у 2014 годзе, ужо прайшлі працэдуру натуралізацыі.

— Што ўяўляе сабой працэс атрымання грамадзянства Рэспублікі Беларусь? Ці дастаткова аднаго жадання, каб стаць нашым суайчыннікам?

— У нас пражывае больш як 170 тысяч замежных грамадзян толькі з відам на жыхарства. Яшчэ звыш 60 тысяч — тых, хто мае дазвол на часовае пражыванне. Гэта сведчыць аб тым, што ахвотнікаў, якія хацелі б атрымаць грамадзянства Беларусі, шмат. Калі б мы прымалі ў грамадзянства кожнага, хто гэтага хоча, то лічбы былі б, вядома, на парадак вышэйшымі. Аднак, і на гэта звяртае ўвагу наш Прэзідэнт, грамадзянства трэба заслужыць. Неабходна сваёй працай, законапаслухмянымі паводзінамі, інтэграцыяй у грамадства даказаць, што ты можаш і хочаш быць грамадзянінам Беларусі. Толькі тады ва ўстаноўленым парадку адміністрацыйная працэдура ў адносінах да цябе па прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь можа быць рэалізавана. У спрошчаным парадку беларускае грамадзянства можа атрымаць этнічны беларус або асоба, якая раней пражывала на тэрыторыі Беларусі, але выехала з краіны да ўступлення ў сілу Закона «Аб грамадзянстве» ад 12 лістапада 1991 года. З Украіны цяпер вяртаюцца і этнічныя беларусы, якія раней пражывалі ў зоне адчужэння, калі пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Яны пераязджаюць сюды, аднаўляюць гістарычныя карані, сваяцкія сувязі. У дачыненні да іх пытанне аб грамадзянстве разглядаецца на працягу трох месяцаў. Пад стандартную працэдуру натуралізацыі трапляюць асобы, якія, атрымаўшы дазвол на пастаяннае пражыванне, мінімум пяць гадоў жывуць на тэрыторыі краіны, маюць законную крыніцу існавання, якая забяспечвае ім і членам сям'і пражытковы мінімум, не выязджаюць з Беларусі больш як на 90 сутак у год, не дапускаюць сістэмнага парушэння адміністрацыйнага і, не дай бог, крымінальнага заканадаўства. Толькі пры выкананні такіх умоў можна падаць хадайніцтва на набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Па кожным выпадку прымае рашэнне кіраўнік дзяржавы.

— Органы ўнутраных спраў не толькі ў прававым полі ажыццяўляюць дапамогу людзям, якія бягуць ад вайны. Вы дапамагаеце перасяленцам у сацыяльнай адаптацыі, садзейнічаеце ў працаўладкаванні і забеспячэнні іх дахам над галавой — у прамым сэнсе несяце адказнасць за чалавечыя лёсы...

— Мы ўзялі на сябе кардынацыю дзяржаўных органаў па выкананні палажэнняў указа Прэзідэнта, які датычыцца дапамогі гэтай катэгорыі асоб на тэрыторыі нашай краіны. Дзейнічае каардынацыйны савет, у які ўваходзяць прадстаўнікі МУС, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Мінадукацыі, а таксама прадстаўнікі міжнародных арганізацый. Савет займаецца вырашэннем пытанняў медыцынскай дапамогі, сацыяльнай абароны, іншым спектрам задач. Украінцы адзначаюць у свой адрас чалавечны дзяржаўны падыход. Украіна афіцыйна закрыла з намі дзяржаўную граніцу, каб яе грамадзяне не прыязджалі ў Рэспубліку Беларусь. А людзі працягваюць ехаць праз трэція дзяржавы, краіны Еўрапейскага саюза. Прыязджаючы да нас, заўважаюць, што тут да іх зусім па-іншаму ставяцца. Дзяржава забяспечвае грамадзянам Украіны выдачу ўсіх дазвольных дакументаў, якія звязаны з міграцыйным правам. Гэта ўсё робіцца аднаразова і бясплатна. Органы па працы і сацыяльнай абароне выдаюць перасяленцам адпаведныя дапамогі, аказваюць медыцынскія паслугі нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, даюць жыллё. Аказваючы пасільную дапамогу, не вядзём гаворку пра спараджэнне ўтрыманскіх настрояў з боку ўкраінскіх грамадзян на тэрыторыі нашай краіны. Мы працягваем руку дапамогі, астатняе залежыць ад чалавека, які павінен працаваць, не парушаць заканадаўства і выконваць правілы, устаноўленыя на тэрыторыі нашай краіны.

— Грамадзянства Рэспублікі Беларусь можна не толькі атрымаць, але і страціць. Якія на гэта павінны быць падставы?

— Перш чым прыняць гэтыя няпростыя рашэнні, якія мы прапанавалі заканадаўцам для карэкціроўкі Закона «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», давялося прааналізаваць заканадаўства замежных дзяржаў. Паўплывалі на новаўвядзенні і пэўныя пагрозы, з якімі мы апошнім часам сутыкаемся. Ёсць катэгорыя асоб, якія маюць дэструктыўную пазіцыю. Юрыдычна гэтыя людзі з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, але з нашай краінай іх нічога не звязвае. Больш таго, сваімі дзеяннямі або бяздзейнасцю, сваімі паводзінамі яны дыскрэдытуюць яе як канстытуцыйную дзяржаву, якая абараняе правы і свабоды грамадзян. Тыя санкцыі, якія ўведзены ў дачыненні да нашай краіны, мы атрымалі ў тым ліку дзякуючы людзям з дэструктыўнай пазіцыяй. Асоба, якая будзе пазбаўляцца грамадзянства, павінна быць асуджана на тэрыторыі нашай дзяржавы на падставе адпаведнага прыгавора суда па крымінальнай справе экстрэмісцкай або тэрарыстычнай скіраванасці. Пры гэтым яна павінна знаходзіцца за межамі Рэспублікі Беларусь і адмаўляцца ад пакарання, устаноўленага прыгаворам суда. Таксама падставай для страты беларускага грамадзянства з'яўляецца паступленне асобы на службу ў замежную паліцыю, замежную армію або на дзяржаўную службу ў іншую краіну. Трэба разумець, што гэта не дзяржава пазбаўляе чалавека грамадзянства, гэта асоба сваімі дзеяннямі сустрачае грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

— Якія яшчэ навацыі прадугледжвае абноўленае заканадаўства аб грамадзянстве?

— Для пэўнай катэгорыі асоб, якія хадайнічаюць аб атрыманні беларускага грамадзянства, уводзіцца абавязковы тэст на веданне любой дзяржаўнай мовы нашай краіны. Веданне дзяржаўнай мовы з'яўляецца асновай інтэграцыі. Узровень гэтых ведаў шэння закона. Акрамя таго, уводзіцца абавязковы інстытут прыняцця прысягі — для таго каб павысіць урачыстасць моманту для чалавека, які хадайнічае аб набыцці грамадзянства. Тэкст прысягі, які на сёння распрацоўваецца, будзе зацвярджацца Прэзідэнтам Беларусі.

— Замацаваны абавязак грамадзяніна Беларусі апавяшчаць кампетэнтныя органы аб наяўнасці грамадзянства замежнай дзяржавы, пасведчання на жыхарства або іншага дакумента замежнай дзяржавы, які дае права на льготы і іншыя прывілеі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю. Які механізм рэалізацыі новаўвядзення?

— Грамадзянства — устойліва-прававая сувязь паміж чалавекам і грамадствам, якая прадугледжвае ўзаемныя правы і абавязкі. У сувязі з мабільнасцю міграцыйных працэсаў, якія адбываюцца ў свеце, дзяржава павінна ведаць, ці ёсць у асобы грамадзянства трэціх краін, іншыя дакументы, якія даюць перавагі і прывілеі на тэрыторыі іншай дзяржавы. Прычым, калі чалавек атрымлівае той ці іншы дакумент, ён прымае ўрачыстую прысягу на вернасць пэўнаму народу або бярэ на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Закон «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь» уступіць у сілу ў ліпені 2023 года. З гэтага моманту пачнецца адлік трохмесячнага тэрміну, у які неабходна будзе праінфармаваць органы ўнутраных спраў або дыпламатычныя службы аб наяўнасці грамадзянства замежнай дзяржавы, пасведчання на жыхарства або іншага дакумента замежнай дзяржавы, якія даюць права на льготы і іншыя перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю. Сёння дзяржаўныя органы распрацоўваюць механізм інфармавання грамадзянамі Беларусі аб наяўнасці ў іх такіх дакументаў. На дадзеным этапе пакуль не стаіць пытанне аб адказнасці за непадаванне адпаведных звестак. Аднак калі актыўнасць нашых грамадзян будзе не вельмі вялікая, а мы ведаем аб людзях, якія жывуць за мяжой і маюць адпаведныя дакументы, то ў выніку ў адносінах да іх будзе ўведзена адказнасць. Таму лепш самастойна праінфармаваць аб тым органы ўнутраных спраў або дыпламатычныя службы, каб у выніку не мець праблем з законам. Акрамя таго, ад гэтых дакументаў можна будзе адмовіцца і здаць іх у органы ўнутраных спраў.

— Яшчэ адзін важны закон, які ўступіць у сілу 1 ліпеня, датычыцца змяненняў у сферы знешняй працоўнай міграцыі...

— Дзяржава лібералізавала працэдуру выезду грамадзяніна Рэспублікі Беларусь праз ліцэнзіята. За мяжой беларусам бяіметрычныя тэхналогіі ў новых дакументах, або ўсё-ткі папяровы пашпарт. Адзначу, што большасць насельніцтва аддае перавагу кансерватыўным дакументам, але ў шэрагу рэгіёнаў фактычна кожны трэці грамадзянін атрымлівае бяіметрычныя дакументы новага пакалення.

— Якія ў іх перавагі?

— Па-першае, гэта наздейная ступень абароны ад падробкі. І калі выпадкі падробкі пашпартоў грамадзян Рэспублікі Беларусь фіксаваліся, то з новымі бяіметрычнымі тэхналогіямі такая магчымасць поўнасцю выключана. Грамадзянін Беларусі, які мае ID-картку, можа атрымаць два бяіметрычныя пашпарты для выезду за мяжу. Прысутнасць замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў на тэрыторыі нашай краіны крыху зменшылася, часта даводзіцца аддаваць свой пашпарт для атрымання візы на пэўны тэрмін, і ва ўладальніка папяровага пашпарта няма ніякага дакумента, які сведчыць асобу. Уладальнік жа бяіметрычных дакументаў, асабліва калі іх два, можа аддаць адзін пашпарт у адно пасольства, другі — у другое і на тэрыторыі краіны мець адзіны дакумент, які сведчыць асобу. Такі чалавек ніяк не абмяжоўваецца ў правах.

— Бязвізавы рэжым для жыхароў Літвы, Латвіі і Польшчы на тэрыторыі нашай дзяржавы падоўжаны. Наколькі актыўна грамадзяне гэтых краін наведваюць Беларусь і ці не садзейнічае дадзенае рашэнне незаконнай міграцыі?

— Аб запатрабаванасці бязвізу ў літоўцаў, латышоў і палякаў сведчыць колькасць перасячэння імі дзяржаўнай граніцы. Летась бязвізавым рэжымам скарысталася 385 тысяч замежных грамадзян, сёлета — ужо каля 30 тысяч. Калі б ім не трэба было наведваць Рэспубліку Беларусь, то яны, вядома, не карысталіся б гэтым правам. Нягледзячы на тыя «страшылкі», якія замежнікі першапачаткова атрымлівалі аб нашай краіне (у прыватнасці, што іх тут затрымаюць), яны едуць да нас. Напярэдадні падпісання адпаведнага распаражэння аб падаўжэнні бязвізавага рэжыму мы атрымлівалі вялікую колькасць зваротаў: нашы суседзі хваляваліся, ці будзе падаўжэнне, бо яны хацелі прыехаць у Беларусь на святы. Заўважу, што да нас прыязджаюць законаслухмяныя грамадзяне, жыхары тых дзяржаў, якія не складаюць міграцыйнай небяспекі для нашай краіны. Інфармацыйныя рэсурсы дазваляюць нам адсочваць іх перамяшчэнне. Такога няма, каб чалавек прыехаў і згубіўся. Рашэнне працягнуць бязвізавы рэжым дэманструе нашу палітыку адкрытасці, добрасуседства, імкненне беларусаў да міру і супрацоўніцтва з усімі, хто будзе ў гэтым зацікаўлены.

Вераніка КАНЮТА.

Юныя патрыёты

«РЫСЯНЯТЫ» КОЛЕРУ ХАКІ

Карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся з выхаванцамі ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь», які з'яўляецца лаўрэатам прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне»

ГЭТАЯ высокая ўзнагарода клубу вайсковай часці 3214 унутраных войскаў МУС была прысуджана за актыўную дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні падлеткаў. Усяго ў падраздзяленнях Міністэрства ўнутраных спраў створана 17 ваенна-патрыятычных клубаў, якія функцыянуюць на тэрыторыі злучэнняў і воінскіх часцей. Школьнікі — як хлопчыкі, так і дзяўчынкі — з нецярпеннем чакаюць тых дзён, калі яны змогуць апрануць выдадзеную ім у клубе воінскую форму і пераступіць парог школы мужнасці і патрыятызму.

Трапныя стралкі і юныя ратавальнікі

У кастрычніку 2021 года, калі ва ўнутраных войсках быў створаны першы ваенна-патрыятычны клуб «Рысь», у ім налічвалася каля 80 дзяцей з Першамайскага раёна Мінска. Цяпер клуб-першапраходзец наведвае больш як 160 хлопчыкаў і дзяўчынак. Самаму малодшаму выхаванцу — 9 гадоў, старэйшаму — 17. У клубе займаюцца дзеці з усіх раёнаў Мінска, прыводзяць сюды сваіх нашчадкаў і жыхары прысталічча.

Заняткі ў ваенна-патрыятычным клубе «Рысь» праходзяць амаль штодзень. Для кожнай групы — двойчы на тыдзень. Па дзве гадзіны — у будны дзень, па чатыры — у нядзелю. Праграма разнайстайная, так што сумаваць школьнікам не даводзіцца. Падчас цыкла прадметаў «Я і мая Айчына» яны больш глыбока вывучаюць гісторыю Беларусі, асаблівая ўвага выхаванцаў скіравана на перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Дзеці з цікавасцю асвойваюць агнявую, страявую, медыцынскую і агульнафізічную падрыхтоўку, рукапашны бой, ваенную тапаграфію, асновы бяспечнай жыццядзейнасці.

— У залежнасці ад пары года, мясцовасці звяртаем увагу выхаванцаў і на правілы паводзін у розных сітуацыях, — адзначае **кіраўнік ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» маёр Руслан ШЫГ.** — Дапусцім, у перыяд ледаставу папярэджваем дзяцей аб адпаведных правілах бяспекі на лёдзе, тлумачым, як аказваць першую дапамогу пацярпеламу. Летам вывучаем небяспечныя расліны і грыбы, трэніруемся арыентавацца ў лесе на выпадак, калі чалавек заблукаў.

За партай у выхаванцаў ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» праходзіць каля 10 % заняткаў. Асноўная ж частка навучальнага працэсу адбываецца ў спартыўных залах і страявых пляцоўках, у цэры і з выездам на мясцовасць. Урокі гісторыі, як правіла, праводзяцца на тэрыторыі сучасных мемарыяльных комплексаў. Не застаюцца ў баку школьнікі і ад удзелу ў рэспубліканскіх акцыях і грамадскіх праектах. У прыватнасці, свой уклад выхаванцы клуба ўнеслі

Руслан ШЫГ.

і ў рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Падчас канікулаў у дзяцей яшчэ больш разнастайная праграма. У суправаджэнні сваіх кіраўнікоў «рысяняты» маюць магчымасць на свае вочы ўбачыць многія гістарычныя мясціны краіны. Апошняя паездка, ад якой выхаванцы клуба дагэтуль пад уражаннем, была ў Брэсцкую крэпасць. Запомнілася дзецям не толькі экскурсія па гэтым святым для кожнага беларуса месцы, а і тое, што яны начавалі ў воінскай часці — а значыць, адчулі сябе ў ролі салдата.

На карысць грамадства

Руслан Шыг нагадаў: ідэйным натхняльнікам стварэння ваенна-патрыятычнага клуба стаў кіраўнік дзяржавы, які падчас аднаго са сваіх выступленняў перад журналістамі звярнуў асаблівую ўвагу на работу з моладдзю. Дзякуючы міністру ўнутраных спраў Івану Кубракову такая задума была рэалізавана.

Большасць выхаванцаў клуба жадае стаць у далейшым вайскоўцамі. «Мы, у сваю чаргу, дзяцей накіроўваем, азнаямляем, арыентуем, прафілюем, аднак ціску на тое, каб яны ў будучыні абралі афіцэрскі шлях, няма, — заўважае камандзір ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь». — Як неаднаразова казаў камандуючы ўнутранымі войскамі Мікалай Карпянкоў, мэта ваенна-патрыятычных клубаў — выхаванне паўнавартаснага грамадзяніна, які ведае свае правы, абавязкі і прыносіць карысць грамадству, якую б прафесію ён ні абраў».

Ваенна-патрыятычная работа на базе злучэння не ўзнікла раптоўна. Цікавасць дзяцей да жыцця вайсковай часці 3214 заўсёды была вельмі высокая. З пачатку 2000-х у перыяд школьных канікулаў на яе тэрыторыі функцыянавалі ваенна-патрыятычныя лагеры. Кожны раз быў аншлаг. Месцаў у лагеры не хапала, а колькасць ахвотнікаў азнаёміцца з укладам жыцця воінскай часці толькі расла, таму меркавалася, што ваенна-патрыятычныя клубы будуць запатрабаваныя ў школьнікаў. І не прагадалі. У гэтым карэспандэнты «Звязды» пераканаліся асабіста.

Прышчэпка ад страху перад арміяй

Вадзім Рагачэўскі ў клубе з першага дня яго існавання. Кажа, што прыйшоў сюды з цікавасці. Цяпер жа не ўяўляе свайго жыцця без заняткаў у «Рысі». Дзевяцікласнік адной з мінскіх школ прызнаецца, што



за амаль паўтара года наведвання клуба, за выключэннем тых дзён, калі хварэў, не прапусціў ніводнага занятку. «Мой бацька — участковы інспектар міліцыі, — з гонарам расказвае юнак. — Гледзячы на яго, таксама вырашыў звязаць сваё жыццё з органамі ўнутраных спраў і абараняць людзей. Я ў гэтым асяроддзі расту, таму прафесія мне будзе блізкай. Планую паступаць на факультэт унутраных войскаў Ваеннай акадэміі і ў выніку служыць ва ўнутраных войсках». Вадзім адзначае, што кожны дзень у клубе не падобны на папярэдні. «Тут ніколі не сумна, — заўважае ён. — Завёў шмат сяброў, займаюся справай, якая мне па душы, — фехтаваннем».

Сярод тых, хто наведвае «Рысь», нямала дзяўчат. Выхавацелі ваенна-патрыятычнага клуба адзначаюць, што прыходзяць яны сюды мэтанакіравана. Як і хлопцы, дзяўчаты разглядаюць клуб як плацдарм для далейшага паступлення ў вышэйшую ваенную навучальную ўстанову.

Знаёмімся з трыма прыгажунямі ў форме колеру хакі. Лізавета Буцэвіцкая марыць стаць ваенным псіхолагам. Дзеля дасягнення сваёй мэты прыйшла ў ваенна-патрыятычны клуб тады, калі ён толькі ствараўся. Паліна Ганчарык наведвае клуб з верасня. Прызнаецца, што больш за ўсё ёй падабаюцца ўрокі стральбы. Паступаць плануе ў Спецыялізаваны ліцэй МУС. Лічыць, у тым, што дзяўчына носіць ваенную форму, умее валодаць зброяй і маршыруе не горш за мужчын, няма нічога дзіўнага. І па прыклад ёй далёка хадзіць не трэба: мама служыць у міліцыі. Яшчэ больш матывуе і ваенная біяграфія дзядулі — кадравага афіцэра. Карына Румянцава прыйшла ў «Рысь» па парадзе бацькі, які ў свой час праходзіў у 3214 часці воінскую службу. «Я з самага дзяцінства цікаўлюся ваеннай тэмай, — прызнаецца дзяўчына. — Не аднойчы бацька браў з сабой на палігон. Больш за ўсё ў клубе мне падабаецца займацца страявой і агнявой падрыхтоўкай».

— Бацькі выхаванцаў клуба адзначаюць, што іх дзеці сталі больш дысцыплінаваныя, павысілася паспяховасць у школе, — звяртае ўвагу Руслан Шыг. — З кастрычніка 2021 года мы вядзём маніторынг, і, сапраўды, у нас няма дзяцей, якія сталі горш вучыцца. Клуб стаў своеасаблівым стымулам атрымліваць добрыя адзнакі ў школе. Мы пастаянна знаходзімся на сувязі з бацькамі, заўсёды адкрытыя для прапаноў і аператыўна на іх рэагуем.

Дар'я Стральчонак у клубе ўсяго другі занятак. Адзінаццацікласніца адной з мінскіх школ пра клуб даведалася ад дзяцей, якія наведваюць яго ўжо працяглы час. Дзяўчына плануе паступаць у ВНУ сілавога профілю. А каб паспяхова здаць уступныя экзамены, варта многаму яшчэ навучыцца — у гэтым, перакананая Даша, ёй дапамогуць настаўнікі клуба.

У студзені кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 2, якім зацвярджаецца новая рэдакцыя Правілаў прыёму асоб для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі. Сярод тых, хто па-за конкурсам будзе залічвацца ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства абароны і Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, а таксама на ваенныя факультэты грамадзянскіх ВНУ, і выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў.

— Ваенна-патрыятычныя клубы становяцца прышчэпкай ад страху перад арміяй, — перакананы Руслан Шыг. — Па фільмах, якія не нясуць жыццёвай праўды, нельга меркаваць аб службе. У клубе ў школьнікаў ёсць магчымасць панаэіраць за вайскоўцамі. Так ці інакш яны сутыкаюцца з аб'ектыўнай інфармацыяй, ведаюць, што адбываецца ў падраздзяленнях, маюць зносіны з салдатамі. І, як бачым, жаданне ў маладых людзей наведваць ваенна-патрыятычны клуб, а ў выніку звязаць сваё жыццё са службай толькі ўзрастае.

Чатырохлапыя сябры

Пазнаёміліся карэспандэнты «Звязды» і з чатырохлапымі выхаванцамі-сімваламі не толькі ваенна-патрыятычнага клуба, а ўвогуле вайсковай часці 3214. Рысі на тэрыторыі падраздзялення жывуць ужо не адзін год. Цяперашнія гадаванцы — Фенікс і Фіёна — чацвёрты і трэці год адпаведна. На пастаяннае месца выхарства на тэрыторыю вайсковай часці жывёлы «пераехалі» не з дзікай прыроды, а са спецыяльных гадавальнікаў. Да прыезду незвычайных «жыхароў» тут рыхтаваліся: вывучалі ўмовы пражывання іх у заапарку і стварылі аналагічны вальер. Патрэбныя вітаміны і харчаванне рысі атрымліваюць у поўным аб'ёме.

Догляд жывёл ажыццяўляе стралок-гранатамётчык Роты ганаровай варты воінскай часці 3214 Дзяніс Еспянка. Каб знайсці агульную мову з рысямі, салдату тэрміновай службы спатрэбілася два тыдні. «Нягледзячы на тое што Фенікс і Фіёна ні дня не правялі ў дзікай прыродзе, інстынкт драпежніка нікуды не дзеўся, — расказвае Дзяніс. — Насцярожваюцца, калі нехта чужы заходзіць у вальер. Незадаволена сябе паводзяць, калі дзеці праяўляюць да іх цікавасць. Прасцей знайсці агульную мову з Фіёнай».

Як высветлілася, практычна ўвесь дзень рысі спяць — рэдка калі днём іх убачыш актыўнымі. Таму тое, што жывёлы выйшлі са сваіх домікаў акурат тады, калі да іх у вальер завітала фотакарэспандэнт «Звязды», лічаць ваеннаслужачыя, вельмі добры знак праяўлення добразычлівасці да сваіх гасцей — такой, якую ў ваенна-патрыятычным клубе «Рысь» выказваюць да кожнага навічка, які марыць прысвяціць сваё жыццё служэнню Айчыне.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Дзяніс ЕСПЯНКА разам з чатырохлапым гадаванцам.

Формула энергапаратунку жылля

Комплексны падыход да будынка і двара

Капітальны рамонт — асноўная жыллёва-камунальная паслуга, якую складае аднаўленне страчаных у ходзе эксплуатацыі ўласцівасцяў будынкаў, іх канструкцыйных элементаў, інжынерных сістэм. Падчас капрамонту выконваюцца менавіта тыя работы, якія скіраваны на аднаўленне пералічанага, паведаміў **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ:**

— Штогод у Беларусі павінна капітальна рамантавацца не менш як 3 % ад агульнага аб'ёму жылля, што эксплуатуецца. Летась пад капрамонт было запланавана 3 млн 600 тысяч м², з якіх зроблена 3 млн 375,5 тысячы м² (93,2 %). З заданнем не справіліся Брэсцкая, Мінская, Магілёўская і Гомельская вобласці, аднак пры гэтым агульны паказчык па краіне — найбольшы за апошняе дзесяцігоддзе.

Сёлета капрамонт жылля прадугледжаны на плошчы каля 3 млн 700 тысяч м² (1108 аб'ектаў). Бягучыя графікі задання практычна сфарміраваны і да 1 лютага з'явяцца на сайтах мясцовых выканкамаў. Гатова і прайшла экспертызу праектна-каштарысная дакументацыя на 83 % гэтых аб'ектаў.

Адпаведна з законам прадугледжана таксама выкананне работ па аднаўленні парушанага падчас капрамонтных работ добраўпарадкавання. Ва ўсіх іншых выпадках добраўпарадкаванне выконваецца за кошт іншых сродкаў, не прадугледжаных на работы па капрамонце. Практыка комплекснага падыходу, калі капітальна рамантуецца некалькі дамоў у межах квартала і добраўпарадкоўваецца агульная дваравая тэрыторыя паміж імі за дадатковыя грошы, існуе, як правіла, у буйных гарадах. У сталіцы яна рэалізоўваецца другі год. Пры гэтым дамаўляюцца таксама з энергазабяспечвальнымі арганізацыямі, каб падчас добраўпарадкавання яны замянілі свае цеплавыя, газавыя сеткі і сеткі водазабеспячэння, каб не даводзілася вяртацца ў такі двор да наступнага капрамонту, дадалі спецыялісты.

Праблема ў падрадчыках, арганізацыі і планаванні работ

Аднак застаецца і шэраг праблем, звязаных з капрамонтам. Найперш яны датычацца якасці і тэрмінаў выканання работ. Праўда, штогод колькасць аб'ектаў з перавышанымі нарматыўнымі тэмпамі будаўніцтва скарачаецца — летась іх паменшала з 214 да 13. Аднак застаюцца пытанні па бягучых аб'ектах.

— Асноўныя прычыны парушэння тэрмінаў — нядобрасумленныя падрадчыкі. Існуюць пытанні, звязаныя з арганізацыяй працэсу выканання будаўнічамантажных работ. Конкурсная сістэма выбару падрадчыка не гарантуе прыходу добрасумленнага, кваліфікаванага, здольнага выканаць адпаведныя аб'ёмы ва ўказаныя тэрміны заказчыка, — агучыў Андрэй Рамашка. *— Летась у снежні ўступілі ў сілу змяненні ў Закон аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП). Згодна з імі, мясцовым распарадчым органам цяпер дазваляецца прызначаць выканаўцаў будаўніча-мантажных работ па капрамонце без правядзення конкурсу з ліку дзяржарганізацый. Мяркуецца, што такім чынам праблема парушэння заказчыкамі тэрмінаў і якасці работ будзе калі не выключана, дык мінімізавана.*

На парушэнне якасці і тэрміну правядзення работ уплывае недастатковая кваліфікацыя работнікаў падрадных арганізацый, пагадзіўся **Павел ДРАЗДОЎ, намеснік начальніка інспекцыі Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам па г. Мінску:**

— Мы назіраем за адпаведнасцю работ, што выконваюцца, праектнай дакументацыі і тэхнічным нарматыўна-прававым актам, кантралюем работу службаў вытворчага кантролю падрадных арганізацый, а таксама работу аўтарскага і тэхнічнага нагляду.

«Капітальны рамонт — асноўная жыллёва-камунальная паслуга, якую складае аднаўленне страчаных у ходзе эксплуатацыі ўласцівасцяў будынкаў, іх канструкцыйных элементаў, інжынерных сістэм. Падчас капрамонту выконваюцца менавіта тыя работы, якія скіраваны на аднаўленне пералічанага».

Распрацаваны планы па наведванні аб'ектаў, так што можна сказаць, што нагляд вядзецца пастаянна. Аб'екты капрамонту, з аднаго боку, — тэхнічна нескладаныя, аднак, пакольк работы на іх спецыфічныя, бо вядуцца без адсялення жыхароў і спынення эксплуатацыі жылля, узнікае шмат невытворчых прычын, якія ўплываюць на якасць і тэрміны работ.

Акрамя таго, некаторыя вобласці не дацягнулі да выканання заданняў у тым ліку і з прычыны недахопу фінансаў, якія сёння бюджэты могуць разам са сродкамі грамадзян прадугледзець на рэалізацыю капрамонту, працягнуў Андрэй Рамашка:

— Яшчэ адзін блок пытанняў звязаны з арганізацыяй. На жаль, не ўсе райвыканкамы належным чынам вядуць работу па своечасовым планаванні, уключэнні аб'ектаў у бягучыя графікі, своечасовай распрацоўцы праектнай дакументацыі. Апошняе павінна быць зроблена яшчэ да ўключэння аб'екта ў бягучы графік, каб ведаць, якія віды работ уваходзяць у капрамонт і якое фінансаванне, — гэта пытанні планавання.

Энергаспажыванне — менш, энергазберажэнне — больш

Каля 30 % жылфонду краіны не адпавядае сучасным нарматывам цеплааховы агароджвальных канструкцый і мае высокія ўдзельныя паказчыкі энергаспажывання ад 160 да 200 кВт•г на м² у год, а ў некаторых дамах — і больш. А паколькі кошт паліўна-энергетычных рэсурсаў пастаянна ўзрастае, рэалізацыя энергаэфектыўных мерапрыемстваў у жылых будынках, якія забяспечваюць зніжэнне ўжывання цеплаэнергіі на ацяпленне, становіцца ўсё больш актуальнай, падкрэсліў **Дзяніс БУЛЫКА, начальнік вытворча-тэхнічнага ўпраўлення Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарту:**

— Цяпер падчас капрамонту робіцца толькі рамонт фасадаў з устараненнем канкрэтных праблем без давядзення супраціўлення цеплапередачы агароджвальных канструкцый да сучасных нарматываў цеплааховы. Каб павысіць энергаэфектыўнасць шматкватэрных дамоў, былі выпрацаваны падыходы па фінансаванні работ па комплекснай цеплавой мадэрнізацыі жылфонду на рэгіянальных узроўнях (яны замацаваны ва Указе Прэзідэнта № 327). Мэта ўказа — стварэнне ўмоў для прыцягнення шырокага кола крыніц фінансавання, у тым ліку сродкаў уласнікаў жылля.

Для дасягнення практычнага выніку па зніжэнні цеплаўтрымання жылфондам у абласцях ужо распачалі такую мадэрнізацыю, пачаўшы яе з найбольш энергазатратных дамоў, пабудаваных да 1996 года з удзельным энергаспажываннем больш як 160 кВт•г на м² у год.

— Фінансаванне і рэалізацыя мерапрыемстваў на першым этапе ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, а ўласнікі пазней будуць вяртаць затрачаныя грошы роўнымі долямі на працягу дзесяці гадоў, — нагадаў спецыяліст. — Найбольш мэтазгодна праводзіць цеплавую мадэрнізацыю разам з капрамонтам, што дазваляе сэканоміць сродкі, а таксама павысіць эфектыўнасць праграмы капрамонту за кошт давядзення будынкаў практычна да стану новых. Такі падыход дазваляе аб'ектыўна вырашаць праблему зніжэння ўдзельнага цепласпажывання дамамі, выходзячы з іх індывідуальных асаблівасцяў і прыняцця ў кожным з іх неабходных мер.

Тым не менш энергаэфектыўныя мерапрыемствы непапулярныя ў жыхароў, якія практычна не праяўляюць ініцыятывы ў дадзеным кірунку, заўважыў Андрэй Рамашка:

— Існуе мінімальны пералік работ, які дазваляе павысіць камфорт пражывання ў памяшканнях: уцяпленне агараджальных канструкцый, гарышча і падвала. Энергаэфектыўнымі мерапрыемствамі прадугледжаны розныя варыянты, аж да магчымасці рэгулявання і пакватэрнага ўліку цепласпажывання, аднак яны непапулярныя. Папулярныя — уцяпленне — мінімізацыя прамярзання агараджальных канструкцый.

Жыхары дамоў, якія мелі праблемы і з прамярзаннем, і недагрэвам, пайшлі на цепламадэрнізацыю будынкаў, плацілі за ацяпленне да 40 рублёў на месяц (кватэра каля 48 м²). Пасля работ яны штомесяц плацяць за праведзеныя энергаэфектыўныя мерапрыемствы па 20—23 рублі ў месяц. Дарэчы, цяпер уласнікі плацяць за паслугу ацяплення каля 20 % ад яе рэальнага кошту і, пэўна, у тым ліку і праз гэта не асабліва зацікаўлены ў энергаэфектыўных мерапрыемствах.

Дзяржэкспертыза — дазвол на эксплуатацыю

Інспекцыя Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам не толькі вядзе ўлік дамоў, дзе ідзе капітальны рамонт і нагляд за яго правядзеннем, але і выдае па выніку работ заключэнне, якое пацвярджае (або не) гатоўнасць аб'екта да эксплуатацыі. А яшчэ законам вызначана, што на аб'ектах капрамонту абавязкова павінна праводзіцца дзяржэкспертыза.

Летась па Мінскай вобласці быў прадстаўлены на экспертызу 361 аб'ект, з якіх 357 атрымалі станоўчае заключэнне, а тры — адмоўнае. У межах сталіцы на экспертызу накіравана 187 аб'ектаў, з якіх 185 атрымалі станоўчае заключэнне, падзяліўся лічбамі **Аляксандр СОНЦАЎ, намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Галоўдзяржбудэкспертыза»:**

— Да працэсу экспертызы заказчык выконвае вялізную работу. Ён праводзіць абследаванне жылых дамоў, фарміруе заданне на праектаванне, заключае дагавор на праектаванне, удзельнічае ў ім, узгадняе дакументацыю перад выпускам яе ў абарачэнне (момант, калі дакументацыя будзе гатовая). І толькі пасля станоўчага рашэння экспертызы заказчык можа пачаць рамонтныя работы. У будаўнічай галіне сотні дакументаў нармавання, многія з якіх не абавязковыя, а добраахвотныя. Мы робім ацэнку адпаведнасці па абавязковых дакументах, звязаных, у прыватнасці, з бяспекай.

Як паскорыць чаргу на капрамонт

Капрамонт у сталіцы летась выкананы на 228 дамах плошчай крыху больш за мільён квадратных метраў. Сёлета капрамонтам плануецца ахапіць амаль 1,1 млн м². Праектная дакументацыя на іх распрацавана, вызначаны выканаўцы работ, а на некаторых аб'ектах работа ўжо пачалася, так што даведзены план мінскія камунальнікі плануюць выканаць цалкам, мяркуе **Вячаслаў БАТУРА, першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

— Дамы трапляюць у спісы аб'ектаў капрамонту ў залежнасці ад свайго тэхнічнага стану. Двойчы на год арганізацыі, якія эксплуатуюць, праводзяць агляд: вясенні і асенні, падчас якога ацэньваецца стан будынка і прымаецца рашэнне аб уключэнні аб'екта ў спісы капрамонту.

Улічваецца таксама фактычны стан дома і год яго пабудовы. Уласнікі могуць на тры-пяць гадоў паскорыць прыняцце рашэння аб капрамонце, вырашыўшы зрабіць у ім цепламадэрнізацыю, дадаў Андрэй Рамашка.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

КАПУСТА АД МАРКОТЫ

Што б такога з'есці ў халады, каб не хварэць і быць у гуморы?

Пра гэта мы запыталіся ў дыетолагаў. І яны сцвярджаюць, што наварыстыя супы, сала, вараная або печаная бульбачка — гэта тое, што трэба. А вось фастфуду і салодкім прысмакам упрыкуску да літраў кавы лепш сказаць рашучае «не».

Адшумелі і адзіхацелі зімовыя святы, і настаў час звычайнага жыцця, а зіма з маразамі, халодным ветрам і раннім змярканнем нікуды не дзелася і будзе з намі, па меншай меры, да пачатку сакавіка. Дрымотнасць і зніжэнне настрою — гэта цалкам нармальная рэакцыя арганізма на рэаліі жыцця: скарачэнне светлавога дня, зніжэнне колькасці ўльтрафіялету і паніжэнне тэмпературы паветра. На ўсё гэта арганізм рэагуе запаволеннем абмену рэчываў і зніжэннем выпрацоўкі сератаніну, гармону добрага настрою. Як следства — зніжэнне працаздольнасці і рухомасці. Каб гэта выправіць, тэрмінова пераходзім на «зімовае паліва» — гэта значыць, звяртаемся да «вопыту продкаў» і мяняем рацыён у адпаведнасці з выпрацаванымі стагоддзямі вопытным шляхам правіламі. Калі з прыходам мінусавых тэмператур вы працягваеце жыць салатнымі лісцікамі і варанай брокалі, прастуды і дэпрэсія на бліжэйшыя некалькі месяцаў вам забяспечаны, і здзіўляцца тут не варта. Лепш пакінуць да цёплых часоў дыеты і пачаць харчавацца «па-зімоваму».

Працэнт тлустасці

Чаму зімой павышаецца апетыт? У халады для жыццядзейнасці нашаму арганізму неабходна атрымліваць больш энергіі — значную частку яе ён накіроўвае на сагравание (як бы цёпла мы ні апраналіся). З прыходам халадоў у нашым арганізме змяняецца цеплаабмен. Крывяносныя сасуды на марозе звужаюцца, а значыць, энергіі для сагравання неабходна больш. Менавіта таму зімой нам хочацца тлустага і каларыйнага. Не варта ігнараваць патрабаванні свайго арганізма. Медыкі раяць з надыходам халадоў павялічыць сутачную каларыйнасць рацыёну мінімум на 10, а лепш на 15 %. І ў першую чаргу ўключыць у рацыён больш тлушчаў. Яны лёгка засвойваюцца, пастаўляюць неабходныя поліненасычаныя тлустыя кіслоты (амега-3-6-9) і спрыяюць засваенню тлушчараспушчальных вітамінаў (A, D, E, K). Тлустая ежа больш павольна расшчапляецца, стабілізуючы ўзровень цукру ў крыві, і мы становімся менш трывожныя, у меншай ступені схільныя да дэпрэсіі. Таму зімой выбар абястлушчаных прадуктаў або поўная адмова ад тлушчаў — няправільнае рашэнне. Тлушчы патрэбныя і раслінныя, і жывёльныя (дыетолагі адзначаюць, што ўзімку іх колькасць, якую мы атрымліваем з ежай, павінна складаць да 30 г у дзень). У зімовым рацыёне неабходныя сметанковае масла, салёнае сала, малочныя прадукты нармальнай тлустасці (вяршкі, смятана, сыры) і, вядома, раслінныя алеі (рапсавы, сланечнікавы, аліўкавы і г. д.). Атрымліваючы тлушчы, арганізм мае магчымасць сагрэцца. Лепш выкарыстоўваць тыя з іх, якія пераварваюцца больш павольна (напрыклад, сала або тыя ж нерафінаваныя алеі). Тады эфект сагравання будзе больш доўгім.

Пры правільным ужыванні бульбы нармалізуецца работа страўнікава-кішачнага тракта, зніжаецца ўзровень цукру ў крыві, умацоўваецца імунітэт і становяцца мацнейшымі косці. Але лепш аддаць перавагу не «пюрэшачцы» з масліцам і малачком ды ўжо зусім не смажанай бульбачцы з салам (як бы смачна ўсё гэта ні выглядала), а запечанай у духоўцы.

Вяртаем на стол кашы

Яшчэ раз падкрэслім для прыхільнікаў «мадэльнай» фігуры: худзець зімой не варта. Разумная мэта — не набраць лішнія кілаграмы, адзначаюць дыетолагі. Каб гэтага дабіцца, не трэба зніжаць сытнасць рацыёну, але важна харчавацца рэгулярна. За аснову меню лепш за ўсё ўзяць бялковыя прадукты і павольна засваяльныя вугляводы. Абавязковыя «зімовыя ўдзельнікі» здаровага меню, асабліва калі на вуліцы стабільны «мінус», — тлустая марская рыба, арэхі і, паўторымся, нерафінаваныя раслінныя алеі. А таксама жывёльныя тлушчы, як ужо раней гаварылася.

Многія сучасныя гараджане, імкнучыся падтрымаць стабільную вагу, адмаўляюцца ад хлеба. І калі казаць аб дражджавой выпечцы — гэта правільна, падкрэсліваюць дыетолагі. Але зімой важна ўключыць у рацыён вырабы з мукі грубага памолу, цэльназерневую пшанічную і жытнюю выпечку (так арганізм атрымае харчовыя валокны, мінеральныя рэчывы і вітаміны групы В, якія, дарэчы, неабходныя нам для добрага настрою і стабільнай работы нервовай сістэмы).

Сытнасці зімоваму рацыёну дададуць кашы (якія нашы продкі традыцыйна елі менавіта зімой). Але гаворка ідзе пра сапраўдныя кашы — не блытаць з кашамі хуткага прыгатавання — тымі, якія «не патрабуюць гатавання», а таксама са шматкамі. Тэхналогія вытворчасці такіх паўфабрыкатаў прадугледжвае тэрмічную апрацоўку злакавых культур. У выніку знішчаецца вялікая частка карысных рэчываў. Акрамя таго, часта вытворца дадае ў «хуткія» кашы падсалоджвалнікі, фарбавальнікі, кансерванты. Вялікая колькасць цукру павышае апетыт і наносіць шкоду сасудам. У крыві хутка расце і гэтак жа хутка падае ўзровень глюкозы — у выніку падстраўніквая залоза вымушана працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. У той час як сапраўдныя кашы, якія гатуюцца з круп па класічных рэцэптах, — гэта як раз крыніца «павольных» вугляводаў і адзін са спосабаў дасягнення добрага самаадчування зімой. Зрэшты, як адзначаюць спецыялісты правільнага харчавання, з агульнага правіла ёсць выключэнне — і гэта аўсяныя шматкі тыпу «Геркулес» (якія трэба варыць, але зусім нядоўга). Для паскарэння гатавання ў гэтым выпадку крупы проста здрабняюць і расплюшчваюць, і такая каша практычна настолькі ж карысная, як з суцэльнай аўсянкі.

Запякаем бульбу

А як наконт бульбы? Адзін з самых спрэчных з пункту гледжання сучаснай дыеталогіі прадукт зімой есці... можна і трэба! Так, гэта крухмалістая гародніна, і набраць лішнія кілаграмы з яе «дапамогай» магчыма. Затое бульба багатая на калій, вітамін С, фосфар, магній і ўсё тыя ж вітаміны групы В, што не даюць упасці ў зімовую дэпрэсію. Пры правільным ужыванні бульбы нармалізуецца работа страўніка-кішачнага тракта, зніжаецца ўзровень цукру ў крыві, умацоўваецца імунітэт і становяцца мацнейшымі косці. Але лепш аддаць перавагу не «пюрэшачцы» з масліцам і малачком ды ўжо зусім не смажанай бульбачцы з салам (як бы смачна ўсё гэта не выглядала), а — запечанай у духоўцы. Такая тэмпературная апрацоўка (у лупіне і без тлушчу або алею) захоўвае ўдарную дозу вітаміну С, калій, натрый і цынк — а значыць, страва ўмацуе сасуды, дапаможа сэрцу і знізіць халестэрын. А калі вараную бульбу астудзіць і ўжываць халоднай, той самы крухмал у ёй набывае найбольш карысную для здароўя форму: ён лечыць і нервовую сістэму, і кішэчнік (але ахалоджаная вараная бульба ў маянэзных салатах — вядома, няправільнае рашэнне). Дыетолагі раяць уключаць у рацыён бульбу, нават правільна прыгатаваную, не часцей за чатыры разы на тыдзень. Чым яе замяніць у якасці гарніру, акрамя каш? Гародніной. Напрыклад, замарожанай. Гатаваць стравы з яе проста, яна захоўвае да 90 % вітамінаў, пастаўляе ў арганізм харчовыя валокны, мікраэлементы і клятчатку, забяспечвае добрае страваванне.

Не адмаўляемся ад мяса

Вегетарыянства, фрутарыянства і іншыя эксперыменты з харчаваннем, калі вы не пераканаы веган, лепш пакінуць да цёплых часоў. Мяса і птушка ў зімовым рацыёне неабходныя, і ў дастатковай колькасці, дыетолагі кажуць, яны павінны складаць 40 % рацыёну. Так у вас будуць сілы і энергія, а млявасць і апатыя адступяць. Акрамя таго, ужыванне мяса засцеражэ нас ад страты мышачнай тканкі і дапаможа арганізму мабілізавацца для барацьбы з інфекцыямі.

А ў цэлым мяса важнае ў рацыёне круглы год. Большая частка жалеза (70 %) у арганізме чалавека знаходзіцца ў складзе гемаглабіну чырвоных крывяных цельцаў, і з яго дапамогай кісларод дастаўляецца клеткам. Мяса, а таксама рыба — найбольш зручныя для чалавека крыніцы жалеза, распавялі ў аддзеле харчавання НПЦ НАН Беларусі па харчаванні. Гемавае жалеза з мяса засвойваецца прыкладна ў пяць разоў лепш за нягемавае, якое змяшчаецца ў раслінных і малочных прадуктах. Дэфіцыт жалеза прыводзіць не толькі да парушэнняў крывятварэння. Ён становіцца прычынай збою ў рабоце ўсіх клетак нашых органаў і сістэм. А часам нават праяўляецца анамаліямі паводзін і псіхічнымі парушэннямі.

Калі мяса вы зусім не любіце, можна часткова замяніць яго рыбай і яйкамі. Дастатковая колькасць вышэйзгаданых прадуктаў зімой — залог таго, што арганізм будзе выпрацоўваць імунныя клеткі. Даказана, што недахоп жалеза прыводзіць да ўразлівасці органаў дыхання і страўнікава-кішачнага тракта для розных інфекцый.



Аўтэнтычная справа

Ёсць людзі тонкай душэўнай арганізацыі, катэгарычна не згодныя, што дрэнны настрой — гэта ў першую чаргу біяхімія і сігнал пра недахоп вітамінаў. Ёсць і тыя, хто пераканаы ў адваротным. Але і тыя, і іншыя паглядзяць на жыццё больш аптымістычна ў халады, калі ўключаць у свой зімовы рацыён на пастаяннай аснове такую аўтэнтычную славянскую страву, як кіслая капуста. Хоць на самай справе гэты адзін з найбольш старадаўніх спосабаў ферментацыі гародніны выкарыстоўваўся яшчэ ў старажытным Рыме, а пра карысць кіслай капусты пісалі нават антычныя лекары. Гатуюць квашаную капусту метадам малочнакіслага закісання. Размнажваючыся, карысныя бактэрыі насычаюць страву арганічнымі кіслотамі, вітамінамі і мікраэлементамі (тое ж самае мы бачым пры заквасцы ёгуртаў). Квашаная капуста багатая на прабіётыкі, паляпшае работу кішэчніка, павышае імунітэт і ўмацоўвае касцявую тканку. А яшчэ дапамагае больш аптымістычна зірнуць на жыццё і змагаецца з дэпрэсіяй.

З прыходам халадоў у нашым арганізме змяняецца цеплаабмен. Крывяносныя сасуды на марозе звужаюцца, а значыць, энергіі для сагравання неабходна больш. Менавіта таму зімой нам хочацца тлустага і каларыйнага. Не варта ігнараваць патрабаванні свайго арганізма.

Вельмі патрэбныя ў зімовым рацыёне і свежая капуста (усе віды), а таксама цыбуля і часнок, кроп і пятрушка, балгарскі перац. Антыаксіданты абароняць ад інфекцый, а вітаміны — ад зніжэння настрою.

Чаго не трэба

Ідэю павялічыць каларыйнасць рацыёну не варта расцэньваць як дазвол ласавацца пірожнымі і есці фаст-фуд. Гамбургеры і бульба фры не прынясуць карысці, не падораць доўгай сытасці, затое дададуць лішніх кілаграмаў. Пірожныя і цукеркі, вядома, дапамагаюць спраўляцца з дрэнным настроем, але насычаюць арганізм хуткімі вугляводамі, якія не даюць сытасці, затое — зноў жа — даюць лішнюю вагу. Зіма, хай доўгая, не вечная, і вясна абавязкова прыйдзе. І вось тады мы скажам сабе «дзякуй» за разумную стрыманасць. Бо калі «зімовых кілаграмаў» не будзе, можна будзе не садзіцца на строгую «вясновую» дыету.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Вогненныя вёскі. Нельга забыць

Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца

Аб трагедыі драгічынскай вёскі Сорацні гавораць сведкі

ВЫЖЫЦЬ, КАБ РАСКАЗАЦЬ ПРАЎДУ

Па звестках базы даных, размешчанай на сайце Нацыянальнага архіва Беларусі, на сёння вядома: у гады Вялікай Айчыннай вайны было спалена з жыхарамі цалкам або часткова 9097 беларускіх населеных пунктаў. У гэтым жалобным спісе ёсць і драгічынская вёска Сорацні. Амаль 80 гадоў мінула з тых часоў, але нічога не забылася — жыхары, якія выжылі ў той страшны дзень, успамінаюць падрабязнасці трагедыі. Гэта памяць, якая так проста не сціраецца, яна застаецца на ўсё жыццё...

Памяць знішчанай вёскі ўвекавечана і на могілках — там, дзе пахаваны бязвінна забітыя мірныя жыхары Сорацняў.

Вёска Сорацні знаходзіцца за 17 кіламетраў ад Драгічына, на самай мяжы з суседнім Іванаўскім раёнам. Да вайны каля вёскі праходзіла дарога або, як яе тады звалі, шлях. Тая дарога ішла з Янова (цяпер Іванава) праз суседнія Верамееўцы (цяпер Сычава) і Заверша на Бездзеж. Сёння яна ўжо не такая значная, як раней. За Сорацнямі дарога праходзіла праз лес — дадзеная акалічнасць у вайну стала фатальнай для жыхароў вёскі. Неўзабаве пасля пачатку вайны ў тутэйшых лясах з'явіліся першыя партызаны з акружэнцаў, былых ваеннапалонных і мясцовых жыхароў. На лясной дарозе яны часта рабілі засады на нямецкія машыны. Гэтую тэрыторыю ў той час кантралявалі партызаны з атрада лейтэнанта Яўгена Макарэвіча, які загінуў у чэрвені 1943 года. Атраду прысвоілі імя загінулага камандзіра, камандаваць ім стаў Аляксей Сямёнаў. Немцы часта ездзілі па дарозе каля вёскі Сорацні — вазілі ў Янова спірт з Опаля. У Опалі, размешчаным за 11 кіламетраў ад Моталя, знаходзіўся спіртзавод, куды таксама часта наведваліся нацысты.

Сведка трагедыі Віктар Пратасевіч.

Хацелі дабіць жывых

Трагедыя ў Сорацнях здарылася не ў адзін дзень. Сведкі распавядаюць, што незадоўга да знішчэння вёскі праз Сорацні праехалі немцы на аўтамашынах, а ўслед ім прагучалі стрэлы. Немцы развярнуліся і паехалі назад у Сорацні. Інцыдэнт са стрэлам ў той дзень сур'ёзных наступстваў не меў.

Аб тым, што там адбывалася, расказаў Віктар Лявончыкевіч Пратасевіч, які знаходзіўся тады ў вёсцы: *«Немцы ехалі з Янова і ўжо праехалі Сорацні. У вёсцы знаходзіліся партызаны, якія стралялі гітлераўцам услед некалькі разоў, а затым схаваліся ў зарасніку дзікага вінограду. Немцы вярнуліся, акружылі вёску, сагналі ўсіх жыхароў у цэнтр. Людзей сабралася нямала. Стаяла гармата, накіраваная на нашу хату. Яна стаяла пасярэдзіне вёскі, каля возера. Маці ў акно зірнула і кажа: «Пойдзем і мы, а то яшчэ страляць пачнуць». Я з мамай і братам бацькі пайшлі туды. Мне была цікавая гармата, на яе ўсе глядзелі. Мама трымала мяне за руку. Усе стаялі і слухалі, што немцы казалі. Вёску тады не спалілі, толькі папярэдзілі, што калі яшчэ раз будуць па іх страляць, то прыедуць і ўсіх пераб'юць. Пасля таго людзі сталі будаваць у лесе хаткі, пакрытыя мохам і верасам, ямы. Нярэдка ў іх начавалі. На другі раз вёску спалілі, людзей забілі. На фурманках прыязджалі. Я хаваўся ў лесе, калі стала гарэць вёска. У хатах людзей забівалі. Засталася жывая пасля расстрэлу Пратасевіч Параскева, яе партызаны прывезлі ў лес. Я бачыў яе параненую. Жанчына потым расказвала, што немцы іх у хаце пабілі, а потым прыходзілі другі раз і казалі: «Калі хто жывы, адгукніцеся, мы вас выратуем». Але ніхто не адгукнуўся, яны хату падпалілі і пайшлі. Гэта яны жывых дабіць хацелі...»*

Хаваліся ў «акопах»

Такія папярэджанні і карныя меры не маглі, аднак, спыніць партызанскую вайну. Партызаны працягвалі выконваць свае задачы па барацьбе з ворагам. Немцы прымянялі метад калектыўнай адказнасці жыхароў блізкіх ад месцаў нападзенняў на іх машыны вёсак. Спальвалі і забівалі па стандартнай фармулёўцы — за сувязь з партызанамі. Як лічылі гітлераўцы, знішчэнне вёсак разам з насельніцтвам павінна было нагнаць страх на астатніх жыхароў, пазбавіць партызанаў прадуктаў харчавання і падтрымкі. Аднак рух супраціўлення толькі ўзмацняўся: пасля такіх трагедый мясцовыя жыхары ішлі ў партызанскія атрады і таксама змагаліся з ворагам.

Паводле сведчанняў відавочцаў, падставай для крывавай расправы над жыхарамі Сорацняў стала засада партызанаў на нямецкія машыны, у выніку якой былі забіты нямецкія салдаты. Месца партызанскай засады знаходзілася на лясной дарозе недалёка ад вёскі, таму вінаватымі зрабілі мірных жыхароў. Па ўспамінах людзей, партызаны папярэдзілі жыхароў аб тым, што немцы могуць прыехаць з Янова і спаліць вёску.

Вяскоўцы і самі разумелі, што добром тое не скончыцца, і сталі прымаць меры. На ноч сем'ямі выязжалі ў лес і там заставаліся да самай раніцы. У многіх людзей былі выкапаны «акопы» — так тамтэйшыя людзі называлі ямы ў зямлі, перакрытыя дошкамі і замаскіраваныя зверху дзірваном, зямлёй і лісцем. У такім сховішчы рабілі невялікі схаваны лаз. У зацішных месцах — у лесе, на агародах і ў кустах — капалі замаскіраваныя сховішчы для сем'яў, каб схавацца пры з'яўленні карнікаў. Многіх жыхароў гэта выратавала ў той страшны дзень: яны пераседжвалі ў «акопах», але частку людзей гітлераўцы ўсё ж адшукалі, расстралялі і спалілі. У асноўным выратаваліся людзі, якія ўначы знаходзіліся ў лясах і «акопах» за вёскай.

144 жыхары спаленай вёскі ўвекавечаны пайменна.

Вярнуліся на папялішча

На досвітку 15 верасня 1943 года немцы акружылі вёску, якая неўзабаве ператварылася ў папялішча. Карная акцыя пачалася, калі яшчэ было цёмна: нацысты хацелі ахапіць усіх жыхароў вёскі.

Мне ўдалося знайсці сведку гэтай крывавай бойні, які знаходзіўся ў тую раніцу ў акружанай вёсцы і цудам уцалеў. З успамінаў Васіля Іванавіча Куровіча, які цяпер жыве ў драгічынскай вёсцы Агдэмер: *«У вайну мы жылі ў Сорацнях. Сям'я наша складалася з шасці чалавек. У той дзень мы былі ў акопе за Вавулічамі. Там і начавалі. Потым надакучыла сядзець, і раніцай пайшлі з дзедам, Пётр яго звалі, у Сорацні дадому. Прыйшлі і не заўважылі, як вёску акружылі. Дзед пайшоў збожжа накрываць — у скрыні яно было закапана за агародам. У гэты час па нас пачалі страляць з кулямёта. Кулі свісталі. Руку дзеду паранілА — шкрабанула і куртку прабіла куля. Сталі заганяць людзей, дзяцей — каго дзе схопяць — у хаты, там і забівалі. Дзед прыбег дадому, калі ўжо пачыналі гарэць хаты з боку Іванава. Схапіў мяне, і мы пабеглі на вуліцу. Уцякаць не было куды. Побач расла капуста. У разору мы з ім і леглі. Мяне ён*

Васіль Куровіч — адзін з тых, каму пашчасціла выжыць.

Маці і бацька Васі Куровіча там былі, а ён сам з дзедам у капусце ляжаў. «Акоп» быў таемны, але немцы заўважылі, што там хаваюцца людзі, і падышлі. Кажуць па-руску: «Вылазьце, да шэфа вас павядуна разбор справы». Загналі ўсіх у нашу хату. Маму звалі Праскоўя, яна ў хаце была. Загналі ўсіх, а там стаяў немец з аўтаматам — ён усіх і біў. Маму маю паранілі — дзевяць куль прайшлі праз яе. Аднак змагла, як карнікі сышлі, у «акоп» запаўзці. Калі пасля трагедыі ў вёску прыехалі партызаны, брат мамы Пётр знайшоў яе параненую і павёз у атрад. Думалі, што яна мёртвая. Дзядзька вёз ужо яе хаваць, але раптам пачуў, што мама дыхае, што жывая».

«Вёз ужо яе хаваць, але раптам пачуў, што дыхае, што жывая»

Гісторыю выратавання Праскоўі Андрэеўны Пратасевіч, якую інакш як цудам не назавеш, цяпер у Сорацнях ведаюць усе і распавядаюць ужо як легенду. Яе дачка Кацярына Фадзеевіна Пратасевіч, жыхарка Сорацняў, расказала, як гэта было: *«У тую ноч шмат людзей з вёскі не паехала ў лес хавацца: ужо восень была, ночы холадна — які сон на возе? Толькі развіднела, як немцы акружылі вёску. Ніхто не паспеў сысці. У нас быў «акоп». Калі б толькі свае схаваліся, то засталіся б жывыя, а так з другіх хат да нас пайшлі хавацца, а немцы іх убачылі ды выгналі ўсіх. Загналі ўсіх у хату. Маму звалі Праскоўя, яна ў хаце была. Загналі ўсіх, а там стаяў немец з аўтаматам — ён усіх і біў. Маму маю паранілі — дзевяць куль прайшлі праз яе. Аднак змагла, як карнікі сышлі, у «акоп» запаўзці. Калі пасля трагедыі ў вёску прыехалі партызаны, брат мамы Пётр знайшоў яе параненую і павёз у атрад. Думалі, што яна мёртвая. Дзядзька вёз ужо яе хаваць, але раптам пачуў, што мама дыхае, што жывая».*

Кацярына Пратасевіч, дачка Праскоўі Пратасевіч, якая, нягледзячы на дзевяць куль, што прайшлі праз яе цела, засталася жывая.

Праз Праскоўю Пратасевіч прайшло дзевяць куль: адна — праз руку, другая — праз грудзі, астатнія зверху выйшлі: у раёне вуха і праз рот. Нягледзячы на гэта, жанчына вылечылася і пасля доўга жыла. Прастрэленую кулямі, шчасліваю світку, яна доўга захоўвала.

«У кожнай хаце людзей забівалі, а потым дамы палілі, — распавяла Кацярына Пратасевіч. — Адзін немец ішоў, на тычку надзеў факел і падпальваў — страхі саламяныя былі і адразу загараліся. Другі адрыны падпальваў. Удзельнічалі ва ўсім гэтым і паліцаі. Яшчэ адна сястра мая стрыечная засталася жывая: купі прайшлі скрозь каўнер яе кофты. Калі карнікі абыходзілі хаты — глядзелі, ці ўсіх забілі, — яна вылезла праз акно. А там калодзеж стаяў блізка, драўляны зруб. Яна залезла ў калодзеж і сядзела там, пакуль людзі з лесу не прыйшлі. Я была ў той дзень у «акопе» на полі. Сяброўка прыйшла і кажа маме: «Адпусціце Кацю са мной у «акоп». Маці пытае: «А там месца ёсць?» Яна кажа: «Ёсць». Я пайшла з ёй, а яны засталіся ў вёсцы. З «акопа» мы ў Верамееўскі лес пабеглі і адтуль бачылі, як немцы гналі карову. Спачатку каровы ішлі, потым авечкі, гусі. У канцы коні ішлі, прывязаныя адзін да аднаго. Сваіх родных, якія загінулі, пахавалі на могілках. У скрыню сабралі

Помнік усім жыхарам вёскі Сорацні, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

ўсё, што ад іх засталося, і дзевяць чалавек пахавалі. Сяло было вялікае — хата на хаце, дзяцей шмат. Многа сірот засталося...»

У кожнага свой лёс

Як усё дзіўна і загадкава бывае ў нашым жыцці. Адных людзей лёс памілаваў — яны засталіся жыць насуперак усяму. Другія назаўжды засталіся ў вогненнай вёсцы. Як часам лёс бывае жорсткі да адных людзей і як шчасліва павярочваецца да другіх.

Час няўмольна ідзе далей, ужо мала засталося сведак гэтай трагедыі. Жыхарка вёскі Ніна Аляксандраўна Максімовіч дагэтуль у падрабязнасцях памятае падзеі таго дня: *«З суседняга сяла Верамеёўцы адзін стары, Чумак, дзесьці даведаўся, што Сорацні будуць паліць, і нам сказаў. Тады ўсе выехалі на ноч у лес, але немцы не прыехалі. Той ноччу не прыехалі, а на другую прыехалі і акружылі сяло. Каго знаходзілі ў хаце, таго забівалі, хаты палілі. Мы з мамай жылі. Я ёй кажу: «Пайшлі і сёння ў «акоп». А яна кажа: «Ты ідзі, а я ў поле пайду». Я пайшла ў лес. Мама накіравалася да суседкі Праскоўі Пратасевіч, а тая ёй кажа: «Чаго ты пойдзеш мучыцца ў той «акоп»? Завошта нас немцы будуць біць? Пастаўкі мы выканалі, дзяцей у Нямеччыну забралі. А калі немцы прыедуць, то пойдзем у наш «акоп». У іх быў у агародзе вялікі «акоп» выкапаны. Вось і пайшла маці да іх. Калі немцы прыйшлі, у гэтым «акопе» засталіся ўсе сваякі: Фадзей, Праскоўя, сёстры Ніна, Оля, дзед Пётр... І мая мама туды трапіла. 12 душ у «акоп» схавалі ся. Немцы ўбачылі іх і ўсіх загналі ў хату. Усіх пастралялі. Дзяўчынка 1925 года нараджэння — Максімовіч Пелагея — засталася жывая. Яна была ў пінжаку, так ён увесь пасечаны кулямі быў, але ў яе не трапіла. Калі карнікі выйшлі, яна вылезла праз акно, скінула пінжак і залезла ў калодзеж. Ведала, што ў калодзежы мала вады было. Знаходзілася там, пакуль людзі з лесу не прыйшлі. Яна стала крычаць, і яе выгнулі з калодзежа. Праскоўя Пратасевіч параненая была, змагла выпаўзці з хаты і запаўзла ў «акоп». Дзевяць куль па ёй выпусцілі, а яна жывая засталася. Наша хата не згарэла, але я засталася адна...»*

У Ніны Максімовіч у агні загінулі ўсе родныя.

Нам патрэбна гэта памяць

Так загінула вёска, у якой да вайны было 83 хаты і пражывалі 317 чалавек. Па апошніх даных, у агні загінулі 144 чалавекі, больш як палова з іх — дзеці. Пасля адыходу карнікаў ад вёскі засталіся чорныя галавешкі ад спаленых хат ды пячныя коміны. Хавалі загінулых на могілках не ў адну брацкую магілу, а асобна — кожная сям'я сваіх. Цяпер гэтыя магілы са сціплымі бетоннымі помнікамі, устаранаванымі пасля вайны, знаходзяцца на мясцовых могілках.

Ужо ў наш час з'явілася магчымасць увекавечыць у Сорацнях памяць аб нявінна забітых і спаленых землях. І коль у цэнтры вёскі стаіць помнік усім жыхарам, загінулым ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—1945 гадах, у тым ліку тым, што ваявалі на фронце і ў партызанах, але палічыліі, што памяць аб трагедыі спаленай вёскі павінна быць ушаснаваная на могілках — там, дзе пахаваны нявінныя мірныя жыхары. Гэта ідэя знайшла водгук у душы неабыякавых людзей — у выніку быў выкананых праект скульптурнай кампазіцыі з дрэва.

Як расказала **Людміла КАРНЕЕВА, каардынатар гуманітарнага праекта «Вёска, якая не павінна знікнуць»**, ініцыятарам увекавечання трагедыі ў Сорацнях выступіла грамадскае аб'яднанне «Тур». Ідэю падтрымала і дапамагло ажыццявіць кіраўніцтва Драгічынскага райвыканкама. Была праведзена вялікая работа: супаставіўшы і прааналізаваўшы ўспаміны жыхароў са спісамі з архіва і кнігі «Памяць», удалося дакладна вызначыць прозвішчы 144 загінулых землякоў. У рабоце па рэалізацыі праекта прынялі ўдзел мясцовыя жыхары, шматлікія энтузіясты, валанцёры БРСМ, ваенна-патрыятычны клуб «Перасвет». У выніку атрымалася скульптурная кампазіцыя, у якой, па задуме аўтараў, ушанаваны тры пакаленні жыхароў спаленай вёскі.

Вядомыя беларускія разьбяры па дрэве Анатоль Турковіч з Камянца, Уладзімір Чыквін з Кобрына і Мікалай Скляр з Гродна выканалі скульптуры з дрэва. Для сваіх твораў мастакі выбралі дуб — дрэва моцнае і прыгожае. У цэнтры кампазіцыі стаяць маці з немаўляткам на руках, а па баках — хлопчык з дзяўчынкай і дзядуля. Побач устаноўлена мемарыяльная дошка, на якой напісаны імёны ахвяр трагедыі. Таксама тут размешчаны ўспаміны мясцовых жыхароў, якія цудам засталіся жывымі ў той дзень. Няма апраўдання таму генацыду, які праводзілі нацысты на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Няма на карце нашай краіны такога месца, дзе б не было спаленых вёсак, забойстваў мірных жыхароў і не лілася кроў.

Вёска Сорацні паля вайны адналася. У дзень памяці — 15 верасня — на мясцовых могілках звычайна праходзіць жалобны мітынг-рэквіем па загінулых у той дзень жыхарах. Свята чытае малітву, выступаюць людзі — просяць Бога не дапусціць больш такой трагедыі, з надзеяй, што так і будзе. Але зноў у розных месцах планеты працягваюцца ваенныя канфлікты, у якіх льецца кроў і гінуць мірныя людзі. Не ўсіх гісторыя навучыла, не ўсе зрабілі высновы з гэтага нацысцкага генацыду. Беларусы — адны з нямногіх, хто захоўвае памяць аб тых страшных падзеях. Вельмі глыбока кранаюць душу словы, напісаныя на мемарыяльнай дошцы каля спісаў ахвяр: *«Мы раслі б, каханымі былі б, бацькамі былі б, дзядамі былі б, мы жылі б...»*

Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

«БІША БО ІХ ІЗ ГРАДА КРЭПКА»

Аблічча Анастасіі Слуцкай

Княгіня-амазонка... Меч у руках красуні, кабарончая сцяна сярэднявечнага горада... Адна з пазнавальных і самых прывабных постацяў беларускай гісторыі, якая, кажуць, стала прататыпам былінаў Настассі Мікулічны. Яе аблічча і подзвіг увекавечаны ў самых розных жанрах мастацтва... Сёлета легендарнай Анастасіі Слуцкай — 550 гадоў. Давайце з гэтай нагоды паспрабуем разабрацца, што мы ведаем пра яе, чаго не ведаем і аб чым здагадваемся.

ЧАМУ АНАСТАСІЯ ВЫЙШЛА ЗАМУЖ ЗА СТРЫЕЧНАГА БРАТА?

Анастасія асірацела, калі ёй не было і дзесяці — бацька, князь Іван Мсціслаўскі, намеснік Менскі і Віцебскі, памёр у 1483-м. Багаты быў род... Таму для дзвюх дачок-спадчыніц знайшліся самыя радавітыя жаніхі. Старэйшая, Ульяна, выйшла за князя Міхала Заслаўскага, для Анастасіі абралі князя Сымона Алелькавіча-Слуцкага.

Няпросты быў лёс жаніха, які, дарэчы, страціў бацьку прыблізна ў такім жа ўзросце, што і Анастасія. Ды не звычайным чынам страціў...

Той бацька, Міхал Алелькавіч, удзельнічаў у закалоце супраць вялікага князя літоўскага Казіміра Ягелона. Вялікага князя павінны былі завабіць на вяселле Ганны Кобрынскай і Хведара Бельскага і забіць. Калі закалот раскрылі, збегчы ўдалося толькі Хведару Бельскаму, а Міхалу Алелькавічу адсеклі галаву на пласе.

На шчасце, удаве Міхала, Ганне Мсціслаўскай, удалося дабіцца, каб ейны сын не пазбавіўся ўсяго — яму пакінулі частку бацькоўскіх уладанняў, Слуцк і Капыль. Але калі настаў час шукаць нявесту, няпроста было знайсці славуты род, які захоча парадніцца са «злачынцамі» і стаць падазронымі ў вачах караля. І Ганна Мсціслаўская вырашыла, што ў нявесткі найлепей падыдзе хтось з пляменніц, дачок яе брата Івана Мсціслаўскага: Ульяна або Анастасія.

Так Анастасія стала жонкай стрыечнага брата Сымона.

ЦІ МАГЛА АНАСТАСІЯ СТАЦЬ ВЯЛІКАЙ КНЯГІНЯЙ?

Малады князь, які вёў паходжанне ад Альгерда, быў дастаткова амбітны і ваяўнічы. Калі хутка пасля вяселля памёр Казімір Ягелон, Сымон выставіў сваю кандыдатуру на трон. Яго падтрымала праваслаўная шляхта. І хоць вялікім князем стаў брат Казіміра Аляксандр Ягелон, Сымон застаўся самым уплывовым у Вялікім Княстве магнатам, а ягонае Слуцкае княства займела аўтаномію. Яно мела фактычна і ўласнае войска, якому давялося адточваць майстэрства ў пастаянных бітвах.

Пагартаем Іпацьеўскі летапіс. *«В лето 7011 (1503). Битикерей, сын Миндикерея царя Перекопских татар, прийде с Татары под Слуцко... и положившеся Татаре кошем под Слуцком, распустиша загоны по своему обычаю, и попленища около Клецка и Несвижа, и замок в Клецку сожгоша, и токмо в шести милех от Клецка возвратишася; паки, в то же лето, прийдоша отай под Слуцко Татаре и пленища даже до Новгородка, и в то время собрася на них Симеон князь Слуцкий со прочими паны, и гониша за Татары даже до Припети. Идеже погромиша и полон отъяша»*.

Такіх запісаў у тагачасных хроніках хапае. Князь Сымон Алелькавіч быў палкаводзец адважны і ўмелы, бараніў свае ўладанні, а таксама праваслаўную веру. Такі чалавек цалкам мог быць дастойным вялікім князем, каб абставіны склаліся інакш.

«Прыжыццёвага партрэта княгіні Анастасіі Слуцкай не захавалася. А выява мелася на фрэсцы Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе. На жаль, фрэска знікла разам са зруйнаваным манастыром... Замацавалася ўяўленне: княгіня абавязкова была прыгожая і, зразумела, дужая і адважная. Гэтыя рысы выявіліся ў помніку, які адкрыўся ў Слуцку перад Палацам шлюбаў. Скульптар Сяргей Аганаў вывучыў шмат партрэтаў той эпохі, у тым ліку тыпажы Алелькавічаў, вось і атрымаўся зборны вобраз».

ЦІ ПРАЎДА АНАСТАСІЯ СЛУЦКАЯ БІЛАСЯ ЯК ВОІН?

Мы ведаем з напісанага пра гэтую гераіню, што яна пасля смерці мужа вымушаная была ўзначаліць абарону Слуцка. Але насамрэч за вайсковую справу Анастасіі давялося ўзяцца раней. Калі была цяжарная другі раз, дачкой Аляксандрай, Сымон Алелькавіч быў у паходзе, а да горада чарговы раз падышлі татары, ажно трохтысячны атрад... І кальчугу княгіня сабе загадзя заказала, і меч у яе быў. Верхам на кані, у даспехах, з мячом у руках княгіня вывела сваё войска супраць татар у поле — і адкінула іх. А князь Сымон ужо ішоў на дапамогу, татар тых дагнаў, «идеже погромиша их и полон отъяша».

А калі князь Сымон Алелькавіч памёр ад халеры, занесенай тымі ж татарамі, Анастасіі давялося ўсе абарончыя справы ўзяць на сябе. Давайце зноў звернемся да летапісу: *«В лето 7013 (1505) идеже старейший сын Махметкерей пойде и положися кошем под Менском, и взят его и всю страну попленил, поведе в плен самых людей кроме товара около ста тысячей, и иного безчисленнаго добра во свою землю повезе; а брат его Битикерей иде под Слуцко, на самое Успение, идеже запреся княгиня Симеонова Анастасия, вдова, со младым сыном Юрием, и хотяху Татаре взяти Слуцк, и не могоша, биша бо их из града крепко»*.

Храніст XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі так апісвае ў вершах адну з вайсковых аперацый Анастасіі:

«Настасся, княгіня Слуцкая, сваіх баяр
Паслала перахапіць палахлівых татар.
Шмат іх пад Капылём было забіта
І горлам ля Пятровіч заплаціла мыта».

Мяркуючы па ўсім, Анастасія Слуцкая сапраўды была беларускай амазонкай, жанчынай-рыцарам.

ЦІ ПРЫМУШАЎ КНЯЗЬ МІХАЛ ГЛІНСКІ АНАСТАСІЮ ДА ШЛЮБУ?

Яркі, але адмоўны персанаж легенды пра Анастасію Слуцкую — князь Міхал Глінскі. Перамога войскаў Анастасіі над татарамі пад Капылём, якую апісваў Мацей Стрыйкоўскі, адбылася незадоўга да славутай бітвы пад Клецкам, у якой дзесяцітысячнае войска пад кіраўніцтвам Міхала Глінскага разбіла трыццацітысячнае войска Біці-Гірэя.

Міхал Глінскі і Анастасія Алелькавіч былі знаёмыя з дзяцінства — бацька Міхала нейкі час служыў у Мсціславе ў яе бацькі. Якія адносіны тады звязвалі дзяцей, можна толькі дадумваць...

У Глінскага была бурлівая маладосць. Ягоны бацька Леў, як і бацька Сымона Алелькавіча, удзельнічаў у закалоце супраць Казіміра Ягелона. Таму і паслаў сына падалей, падарожнічаць па Еўропе. Міхал Глінскі быў высокага росту, моцны, недарэмна меў мянушку Мажны. За дванаццаць гадоў падарожжаў вывучыў усе еўрапейскія мовы. Сябраваў з манархамі, ваяваў то за аднаго, то за другога, атрымаў ордэн Залатога руна, праславіўся і ў рыцарскіх, і ў куртуазных забавах. Скончыў медыцынскі факультэт Балонскага ўніверсітэта, у Рыме браў урокі жывапісу, аднойчы спакусіў пляменніцу Папы Рымскага, у карчомнай бойцы скалечыў сына дэкана і ўцёк у якасці матроса на караблі...

Карацей, князь Міхал Глінскі быў з тых, хто не супраць і на каралеўскі трон замахнуцца. Мацей Стрыйкоўскі ў сваіх хроніках занатаваў, што Глінскі сватаўся да аўдавелай Анастасіі, але атрымаў адмову і тады паспрабаваў захапіць Слуцк сілай. Некаторыя ставяць пад сумніў гэтыя звесткі — Стрыйкоўскі быў храністам заангажаваным, працаваў на ворагаў Глінскага, які на той час стаў перабежчыкам. Рамантычная гісторыя пра каханне да немаладой ужо жанчыны, ад якой страціў розум трыццацівасьмігадовы Глінскі, падаецца малаверагоднай. Зразумела, шлюб быў бы выгадны для князя, і не адмовіўся б ён дадаць да сваіх уладанняў Слуцк і Капыль. Але ўсё-ткі асаджаў Слуцк не ён сам, а ягоны стрыечнік Андрэй Дрождж. У Іпацьеўскім летапісу чытаем: *«1514: В сие лето Глинский некто в Литве много зла починил... и Слуцко хотел взяти под Анастасиею княгинею Симеоновою, но не може, тылко волость ея якоже Татаре поплени»*.

Згаданы Дрождж, дарэчы, вельмі мутная асоба. Кажуць, менавіта з-за яго Глінскі перасварыўся з многімі магнатамі. Глінскі пазнаёміў Дрожджа з вялікім князем Аляксандрам, той змог спадабацца ўладару і атрымаў ад яго Лідскае намесніцтва — смачны кавалачак, адабраны ў магната Юрыя Ільініча.

Лідская шляхта новага намесніка не прызнала, а кароль абвінаваціў у бунце Ільініча і загадаў пасадзіць у вязніцу. Калі Аляксандр Ягелон памёр, Ільініч вызваліўся і тут жа пачаў інтрыгаваць супраць Глінскага... Такі вось беларускі Яга часоў ВКЛ, гэты Андрэй Дрождж... Не здзіўлюся, калі высветліцца, што ён, каб выслужыцца перад дабрадзеем — стрыечным братам, праявіў ініцыятыву і ўзяўся асабліва жорсткімі сродкамі здабываць таму нявесту. Хоць трэба прызнаць, што і Міхал Глінскі не выяўляў сентыментальнасці на шляхах да мэты. Учыніць набег, адсекчы галаву ворагу і вазіць яе насаджанай на калацін — запраста.

Дарэчы, у змаганні з войскам Дрожджа праявіўся падрослы княжыч Юрый, сын Сымона і Анастасіі: прабраўся з войскам у тыл ворагам і змусіў іх адступіць.

ЯК ЯНА ВЫГЛЯДАЛА?

Прыжыццёвага партрэта княгіні Анастасіі Слуцкай не захавалася. А выява мелася на фрэсцы Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе. На жаль, фрэска знікла разам са зруйнаваным манастыром. У царкве Слуцкага праваслаўнага Свята-Траецкага манастыра захоўваліся партрэты Сымона і Анастасіі Слуцкіх, але выкананыя ў іканапіснай манеры, то-бок умоўныя. Замацавалася ўяўленне: княгіня абавязкова была прыгожая і, зразумела, дужая і адважная. Гэтыя рысы выявіліся ў помніку, які адкрыўся ў Слуцку перад Палацам шлюбаў.

Скульптар Сяргей Аганаў вывучыў шмат партрэтаў той эпохі, у тым ліку тыпажы Алелькавічаў, вось і атрымаўся зборны вобраз.

У фільме па сцэнарыі драматурга Анатоля Дзялендзіка Анастасія Слуцкая — асоба даволі рамантычная. Балет «Анастасія», музыку да якога напісаў Вячаслаў Кузняцоў, паказвае гераіню ў розных іпастасях — ад закаханай дзяўчыны да ўладаркі. Мастакі любяць маляваць княгіню ў даспехах, з мячом.

Цікава, што, прынамсі, два нашчадкі Анастасіі Слуцкай прылічаныя да ліку беларускіх святых. Гэта яе ўнук Канстанцін (Васіль) Астрожскі, сын вялікага палкаводца Канстанціна Астрожскага і дачкі Анастасіі Аляксандры. А ўнучцы Анастасіі, святой Сафіі Алелькавіч, дачцы Юрыя Алелькавіча, у Слуцку таксама стаіць помнік.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

«ВЫ, ПАНОЧКІ, САКАЛОЧКІ, ПАСЛУХАЙЦЕ ГУТАРОЧКІ...»

Каго хаваў пад маскамі сваіх герояў Дунін-Марцінкевіч?

Пра лёс гэтай гістарычнай асобы можна пісаць і вадэвіль, і трагедыю, і эпас. Сюжэтных хадоў хапае... Чаго варты эпізод, калі наш герой звёз непаўналетнюю дачку свайго работадаўца, каб таемна павянчацца, і хаваўся ў рэздэнцыі біскупаў? Гадаваўся ў сваяка, славутага мітрапаліта. Потым паступіў у Віленскі ўніверсітэт на медыцынскі факультэт, «але пры першым рэзанні трупа абамлеў». У маладосці прайшоў шмат судоў з-за абвінавачання ў падробцы дакументаў. Маўляў, выдаваў фальшывыя пасведчанні аб шляхецтве. Але малады чалавек бліскуча выйграў усе суды. Розум быў востры, язык падвешаны... І наконт ягоных дачыненняў з інсургентамі нічогенька не давялі — хоць не магло такога не быць... А пасля забароны паказваць яго спектаклі на беларускай мове на афіцыйных сцэнах гэты чалавек разам з дочкамі ездзіў па вёсках і разыгрываў прадстаўленні. Школку хатнюю стварыў, вучыў дзетак па-беларуску. І тое забаранілі...

Думаю, вы ўжо здагадаліся, што герой наш — Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, адзін з заснавальнікаў беларускага тэатра і літаратуры... Які нарадзіўся 215 гадоў таму. Ягонай творчасці і таямніцам біяграфіі прысвечана мноства манаграфій, навуковых артыкулаў, мастацкіх твораў... Не мог ён і ва ўласных творах не адлюстраваць падзеі свайго жыцця і рэальных людзей, з якімі зводзіў лёс, хоць і добра замаскіраваўшы часам... Якія ж рэальныя гістарычныя персанажы хаваюцца за маскамі?

НАВУМ ПРЫГАВОРКА

У 1852 годзе нейкі спадар Ц.Л. з Мінска надрукаваў рэцэнзію на оперу «Сялянка», прадстаўленую 9 лютага ў мінскім гарадскім тэатры:

«Гэтымі днямі на карысць бедных было дадзена амататарамі некалькі прадстаўленняў... Два разы ставілася опера «Сялянка», напісаная Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам, музыку якой часткова напісаў Станіслаў Манюшка... Вельмі добра выглядаў сам аўтар у ролі Навума Прыгаворкі і ў танцы «Мяцеліца», які ўсе ўдзельнікі і ўдзельніцы выконвалі вельмі ўмела. Ніхто не стане адмаўляць здольнасцяў Дуніна-Марцінкевіча як у галіне драматургіі, так і паэтыкі, і калі б яго творы былі пастаўлены на вялікай сцэне, ад гэтага, бясспрэчна, была б карысць як для тэатра, так і для аўтара».

Герой «Сялянкі», альбо «Ідыліі», войт Навум Прыгаворка — мудры беларус. Ведае сабе цану, з выдатным пачуццём гумару і годнасці, але можа прыстасавацца да абставін, каб выжыць. Вось прыязджае ў вёску з-за мяжы паніч, прагрэсіўны да зорачак у вачах. Навум яго і вітае: «...а ты ж нам дарагі госць, як яснае солнышка; прыляцеў жа ж ты к нам, як чайка з-за мора; прыляцеў, штоб нас, сірот бедных, пацешыць»... І столькі ж іроніі за гэтым хаваецца!

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч сам меў, як піша даследчык Усікаў, «празмерную схільнасць, страсць бясконца сыпаць прыказкі і прымаўкі — з прычыны і без прычыны, калі дарэчны, а калі і недарэчны». І нездарма Дунін-Марцінкевіч выкарыстоўваў імя сваго героя як уласны псеўданім — бо менавіта сваё альтэр-эга ў ім і выявіў. Характэрна, што герой гэты не ідэальны, апісаны з уласцівай аўтару самаіроніяй.

ПАН КАБЫЛЕЎСКІ, КАРОЛЬ ІЛГУНОЎ

У п'есе «Пінская шляхта» адзін з ганарыстых шляхцюкоў, Базыль Статкевіч, абураецца: «Ён смеў назваць мяне мужыком? Мне сам пан Ежы Кабылінскі падпісаў грамату. То ж я на скуры яго выпішу маё шляхецтва».

Пан Ежы, альбо Юрый Кабылінскі, сустракаецца ў творах Дуніна-Марцінкевіча неаднойчы. У паэме «Вечарніцы» расказваецца пра прыгоды мужыка Зміцера:

Паехаў неяк Зміцер з лошыцкай дарогі ў Мінск прадаваць пеўня. А тут згаданыя паны-жартаўнікі адзін за адным давай падыходзіць да яго і пытацца, пачым заяц. Бо, маўляў, ён жа менавіта зайца прадае! Так задурылі небараку галаву, што ён і сапраўды паверыў, што трымае ў руках не пеўня, а зайца... А калі «заяц» закукарэкаў, і ўвогуле вырашыў, што мае справу з нячыстай сілай.

Ну, не вельмі добры жарт... А вось жартаўнік Юры Себасцянаў Кабылінскі — персанаж цалкам рэальны, тытулярны саветнік і кавалер, блізкі сябар Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, з якім не адзін вечар прабавілі за вясёлымі размовамі ды жартамі. Зрэшты, усе мінчукі павінны добра ведаць пана Кабылінскага — па браме Кальварыйскіх могілак, на якой значыцца яго імя як фундатара, што ўзвёў велічную каменную браму ў памяць сваёй жонкі Юзэфы Кабылінскай, памерлай у 1830 годзе. Кабылінскі быў аўтарам-складальнікам беларускага зборніка «Тысяча і адна фацецыя», рукапіс якой, на жаль, знік. А яшчэ калекцыніраваў прадметы мастацтва і старажытнасці. На прамысловай выставе ў Мінску ў 1837 годзе былі прадстаўлены «акамянеласці, буршытын, зуб маманта, знойдзеныя тытулярным саветнікам Юрыем Кабылінскім». Ягоны «кабінет рарытэтаў» быў набіты старадрукамі, жывапіснымі палотнамі, пергаментнымі рукапісамі, губернатар Хведар Мірковіч бачыў там Статут Літоўскі і нават «карту Хрыстафора Калумба».

АНТОН САБКОВІЧ

Дунін-Марцінкевіч часта даваў сваім героям «гаворачыя» імёны. Прыкладам, у п'есе «Залёты» ёсць персанаж, які завецца Антон Сабковіч па мянушцы Дарабкевіч. У перакладзе з польскай мовы «sobkiewicz» азначае «эгаіст», «сабедбаец», а «dorobkiewicz» — «выскачка», «нуварыш». У спісе «Залётаў», які належаў прафесару Эпімах-Шыпілу, персанаж завецца Антон Сабкоўскі, але сэнсу гэта не мяняе. Прайдзісвет, чый дзвіз «Маю грошы, маю я, мне ніхто тут не раўня», сватаецца да прыгажуні Адэлькі, бо паддобрыўся быў да яе прастадушнага бацькі. Прыкінуцца ён можа, вось што распавядае пра сябе сястры: *«Ось, напрыклад, шумна ўходжу да панскай салі, поўнай гасцей, дык што ж... прыбліжаюся да пані-гаспадыні, трымаючы левую руку ў кішэні, а праваю, як бы не хочучы, цісну ёй ручку так — па-панску і кажу праз нос: коман ва, як здароўечка, як ідзе гаспадарка, і так далей, — цікавасць... Дык што ж... пасля падыходжу да гаспадара, з каторым, як роўны з роўным, цалуюся; далей, усунуўшы ўжо абедзве рукі ў кішэні і як бы не хочучы, бразгаю сумысля ўсыпаным туды золатам, навокал з гары ўзіраюся і з павагаю... Потым іду да паненак і, як бы ненарокам, кідаю залатую манету на зямлю, і раблю гэта, ведама, тады, калі блізка, дык што ж... лёкай круціцца; ён, падбегшы, падымае грошы і хоча мне аддаць, тады я спакойна, арыстакратычна кажу: «Пакінь гэта сабе, даражэнькі», і... дык што ж... Як бы нічога не было, пачынаю з паненкамі... дык што ж... жартаваць, бразгаючы ўсё золатам у кішэнях; вяду гутарку аб пагодзе, апратках, хлапцах ці аб нечым падобным, дык што ж... А! а! ці ты ведаеш, сястрыца, што я ўжо і кантраданса ўмею скакаць...»*

Ці не праўда, нагадвае пана Быкоўскага з Купалаўскай «Паўлінкі»? На шчасце, Сабковіча выкрывае стары сябар Адэлькавага бацькі:

«Мушу табе адкрыць вочы: Сабковіч — невядомага роду, гадоў з дваццаць таму назад пасвіў быдла ў сваіх сваякоў; навучыўшыся крыху чытаць і пісаць, дастаў, на нясчасце маіх сваякоў Сулікоўскіх, месца пісара і тамака, добра нахапаўшыся, пакінуў службу. Праз нейкі час мы яго бачым у пані Валовічыхі, кабеты з анёльскім сэрцам і надта даверлівай. Не марнаваў ён і тамака часу, добрым прыкладам чаго можа быць здарэнне ў адным мястэчку, гдзе людзі Валовічыхі, пазнаўшы на конях «дарабковіча» хамуты сваёй пані, хацелі

зацягнуць яго ў стан, і, каб не ўцёк, добра меўся б галубок. Але найвялікшай запамогай ямубыла смерць графа Багацкага. Нябожчык, падаючы ў ваду, выкінуў з бакавой кішэні бумажнік, а як ён трапіў да Сабковіча, ведама не толькі Богу, а і людзям. Ось скуль яго багацце! Потым ён узяў у арэнду нямалы хвальварак і заняўся быццам таргоўляй, каб замрочыць людзей. Ессе homo!»

Калі Эпімах-Шыпіла перапісваў п'есу, скапіраваў і заўвагу, якая была каля рэплікі Сабковіча: *«Доўнар, вядомы гультай-выскачка з Мінскага павета, жыўцом тут узяты»*.

І сапраўды, у архіўных дакументах ёсць паказанні суседа Дуніна-Марцінкевіча, адстаўнога унтэр-афіцэра Фёдара Іванова, які даносіў: «у фальварку Люцынка даволі часта збіраліся дваране Уладзіслаў Слаута, [Васіль і Антон] Доўнары і валасны пісар Трасцянка (быў у шайцы і вызвалены на парукі), якія разам з дочкамі Марцінкевіча спявалі забароненыя гімны».

Невядома, наколькі той Антон Доўнар у жыцці быў злачынцам, але рысы яго характару пэўна ўвекавечыў дасціпны сусед.

СТАНАВЫ ПРЫСТАЎ КРУЧКОЎ

Ну і жорстка ў фарсе-вадэвілі «Пінская шляхта» адлупцаваны бюракраты-кручкатворы... Сярод іх вылучаецца станавы прыстаў Кручкоў, які спрытна абірае абодва канфліктуючыя бакі, карыстаючыся шляхецкай пыхаю і невуцтвам. Наставіць адзін вус угору, другі ўніз, і шпарыць назвы законаў, тыпу «По указу всемилостивейшей государыни Елисаветы Петровны 49 апреля 1893 года и всемилостивейшей Екатерины Великой от 23 сентября 1903 года». Сюжэтам для п'есы паслужыла вельмі гучная судовая справа пра альпенскіх шляхцюкоў Цюхаеў-Ліпскіх, якія не хацелі пераходзіць у праваслаўную веру. Заведзеная ў Мінскай духоўнай кансісторыі «Справа № 38» была распачата 17 лістапада 1837 года і цягнулася трыццаць тры гады. Дунін-Марцінкевіч добра ведаў судовую сістэму знутры і яе служак, да таго ж служыў у Мінскай кансісторыі пад кіраўніцтвам біскупа Мацвея Ліпскага. Правобразам Кручкова, па меркаванні многіх даследчыкаў, стаў обер-пракурор граф Мікалай Пратасаў. Пісьменнік Уладзімір Ліпскі падмеціў, што манера выказвання Кручкова вельмі падобная да пасланняў Пратасава. Уладзімір Ліпскі лічыць, што прозвішча яшчэ аднаго героя п'есы, шляхціца Ціхана Пратасавіцкага, невыпадковае і наўпрост намякае на асобу обер-пракурора Пратасава.

Творы сёлетняга юбіляра прайшлі выпрабаванне часам, выведзеныя ім персанажы па-ранейшаму выклікаюць смех і эмоцыі ў гледача... А мы можам з удзячнасцю ўявіць нашага героя як жывога ў іпастасі Навума Прыгаворкі, які, паскакаўшы «Мяцеліцу», у канцы першай беларускай оперы спявае:

«Вы, паночкі, сакалочкі,
Паслухайце гутарочкі:
Хоць умерці не падацца,
Каб вам толькі спадабацца.
Не зрабіце ж вы нам мукі;
А злажыўшы гэтак рукі,
У далоні моцна біце,
Потым... дахаты ідзіце».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

КАНПЕТРЫ, «ЕСЕНТУКІ» І ПЧАЛЯРСТВА

Што цікавага на выставе, прысвечанай сяброўству Глебкі і Броўкі

У экспазіцыі новай выставы «Не ідзі па глебцы, а ідзі па броўцы!..», якая працуе ў Літаратурным музеі Петруся Броўкі, можна заўважыць фотаздымак 1968 года. На ім Кандрат Крапіва, Пятро Глебка і Пятрусь Броўка шпацыруюць па пасёлку ў Ждановічах, які ў народзе насіў назву Пісьменніцкія дачы. Але сябры прыдумалі яшчэ адну назву, якая аб'ядноўвала менавіта іх лецішчы, — Канпетры. Разгадаць рэбус даволі проста: першы склад утварыўся ад імя Кандрата Крапівы, другі — ад імёнаў Глебкі і Броўкі. Аб іншых цікавых фактах з біяграфій класікаў арганізатары распавялі падчас адкрыцця выставы.

Навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі Віктар СВЯКЛА падзяліўся такой гісторыяй:

— «Хтосьці ўспамінаў, што апошняя кніга, якую трымаў у сваіх руках Пятро Глебка, — «Гаючыя якасці пчалінага мёду»: ён настолькі цікавіўся гэтай тэмай, што займаўся пчалярствам, меў на сваім дачным участку пчальнік. Перад смерцю Глебка спадзяваўся, што мёд працягне яго жыццё. Калі мы выдалі каталог кніг з бібліятэкі паэта, мяне зацікавала пытанне: ці існуе гэтая кніжка? Аказалася, што яе няма. Я вырашыў, што, магчыма, хтосьці проста прыдумаў такую цікавую легенду. Але кніга знайшлася: праз некалькі гадоў адна са сваячак Глебкі прынесла нам каля пяці кніг на тэму пчалярства, яны захоўваліся не ў кватэры класіка, а менавіта на ягоным лецішчы.

— У архіве Бэндэ не так ярка прадстаўлены Пятро Глебка. Адзінае, што згадваецца ў архіве, — верш-эпітафія 1933 года пад назвай «Новы Ойча наш». Для мяне пакуль загадка, чаму менавіта гэты верш там прысутнічае. Больш Глебка прадстаўлены ў звестках, якія сабраў Адам Бабарэка.

У экспазіцыю выставы ўвайшлі дакументы, якія сталі сведкамі і пацвярджэннямі доўгага сяброўства. Гэта і больш асабістыя рэчы: бутэлька напоя «Есентукі», якая была набыта сябрамі падчас вандроўкі, попельніца — яна заўсёды стаяла на стале падчас сумеснай работы класікаў, а таксама фотаздымкі са сваякамі і сябрамі. Ёсць і вялікая колькасць афіцыйных дакументаў: лісты, зборнікі «Маладняка» і «Узвышша», кнігі з аўтарскімі подпісамі, якія Глебка і Броўка дарылі адзін аднаму.

Арганізатары выставы «Не ідзі па глебцы, а ідзі па броўцы!...» абяцаюць, што ў іх засталося яшчэ шмат гісторый аб сяброўстве вядомых беларускіх творцаў. Каб бліжэй пазнаёміцца з біяграфіямі класікаў, прыходзьце ў Літаратурны музей Петруся Броўкі.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Алег ШЭПЕЛЬ:

«СУСВЕТНЫ ПАРАЛІМПІЙСКІ РУХ МНОГАЕ СТРАЦІЎ АД НАШАЙ ІЗАЛЯЦЫІ»

ГІСТОРЫЯ паралімпійскага спорту — паказчык развіцця краіны, яе прагрэсу, адкрытасці грамадства. Інклюзіўная адукацыя, безбар'ернае асяроддзе, сацыяльная адаптацыя інвалідаў — самыя відавочныя пытанні, звязаныя з развіццём паралімпійскага руху. Узначальваць паралімпійскі рух — значыць адказваць за ўсё і ўсіх. З гэтай задачай больш за 20 гадоў спраўляецца Алег Шэпель — чалавек, які стаяў каля вытокаў развіцця паралімпійскага спорту ў Беларусі. На Паралімпійскіх гульнях 1988 года на спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы ён заваяваў тры залатыя медалі, першыя паралімпійскія ўзнагароды ў гісторыі беларускага спорту. За сваю спартыўную кар'еру Алег Шэпель стаў пяцікратовым чэмпіёнам і тройчы бронзавым прызёрам Паралімпійскіх гульняў, чатырохразовым чэмпіёнам свету, шасцікратовым чэмпіёнам Еўропы, 13 разоў аднаўляў сусветныя рэкорды. Таксама Алег Шэпель — самы малады заслужаны майстар спорту СССР у лёгкай атлетыцы. У 2001 годзе чэмпіён скончыў спартыўную кар'еру і ўзначаліў Нацыянальны паралімпійскі камітэт.

Ігар Бокій, Ганна Канюк, Ядзвіга Скорабагатая, Васіль Шапцябой, Святлана Сахаленка і многія іншыя беларускія спартсмены ўпісалі свае імёны ў гісторыю айчыннага паралімпійскага руху. Імі захапляліся, за іх радаваліся мільёны людзей па ўсім свеце. Але з'явіліся і тыя, хто вырашыў адабраць у паралімпійцаў справу іх жыцця. У лістападзе 2022 года на пазачарговай генеральнай асамблеі ў Берліне Міжнародны паралімпійскі камітэт (МПК) прыняў рашэнне аб прыпыненні членства Паралімпійскіх камітэтаў Расіі і Беларусі. Прычынай адхілення МПК назваў «няздольнасць выконваць абавязацельствы па членстве ў адпаведнасці са Статутам МПК». За гэтымі сухімі словамі стаіць лёс 98 членаў беларускіх нацыянальных і зборных камандаў па паралімпійскіх відах спорту, якіх у Беларусі 14 (для нашай невялікай краіны — красамоўная лічба). Але апусціць рукі і здацца на волю лёсу — не для паралімпійцаў. Яны так ніколі не рабілі і рабіць не будуць. А што будуць рабіць і як далей будзе развівацца паралімпійскі спорт у Беларусі, «Звязде» расказаў Алег Шэпель, якога ў пачатку студзеня пераабралі на пасаду старшыні Нацыянальнага паралімпійскага камітэта.

— Алег Аляксандравіч, самае злабадзённае пытанне. Як выражаецца праблема з прыпыненнем членства нашага паралімпійскага камітэта ў Міжнародным камітэце?

— Сумесна з юрыстамі, спецыялістамі Міністэрства юстыцыі і Міністэрства замежных спраў мы падрыхтавалі дакумент, дзе ў 27 пунктах абгрунтавалі, што мы не парушылі ні аднаго пункта Канстытуцыі Міжнароднага паралімпійскага камітэта, не парушалі Алімпійскую хартыю, этычныя нормы. На жаль, падвойныя стандарты, пра якія сёння так шмат кажуць, дайшлі і да паралімпійскага спорту. Я ўжо неаднаразова казаў, што калі раней спорт быў проста з элементамі палітыкі, то цяпер цалкам стаў палітыкай, што зусім не радуе. Спорт павінен не раз'ядноўваць, а аб'ядноўваць, асабліва людзей з абмежаванымі магчымасцямі. На пазачарговай асамблеі Міжнароднага паралімпійскага камітэта, дзе было прыпынена наша членства, са 184 краін прысутнічалі толькі 117 дэлегацый. З іх 54 прагаласавалі супраць нас, 45 — за. А яшчэ 16 устрымаліся, пераважна краіны Лацінскай Амерыкі, якім паабяцалі фінансавую падтрымку. І, што самае цікавае, на асамблеі не прысутнічалі краіны постсавецкай прасторы, дэлегацыям якіх не далі візы. Думаю, постсавецкія краіны нас падтрымалі б і праўда была б на нашым баку.

Сёння абмяркоўвацца прапанова аб тым, што выканкам Міжнароднага паралімпійскага камітэта можа прымаць любыя рашэнні аб дыскваліфікацыі спартсменаў, трэнераў, нацыянальных паралімпійскіх камітэтаў без тлумачэння прычын. Гэта ж беззаконнасць! Яны разумеюць, што парушылі ўсе нормы і зараз ім патрэбен дакумент, які будзе гэта апраўдваць. Мы падалі апеляцыю ў трыбунал Міжнароднага паралімпійскага камітэта. На працягу трох месяцаў яны павінны стварыць камісію, якая будзе разглядаць нашу апеляцыю. Але мы разумеем, што з гэтым яны будуць цягнуць да апошняга. Зараз мы на свае вочы назіраем раскол у сусветным паралімпійскім руху. Некаторыя краіны нас падтрымліваюць: Азіяцкі паралімпійскі камітэт, Катар, Саудаўская Аравія, нават Латвія за нас. Усе разумеюць, што без расійскіх і беларускіх паралімпійцаў узровень чэмпіянатаў Еўропы і свету, Паралімпійскіх гульняў зніжаецца. А гэта ўплывае на колькасць тэлегледачоў, рэкламнае супрацоўніцтва, на чым завязаны фінансавыя паступленні. Вядома, ім гэта нявыгадна. Але, я думаю, калі прынялі такое рашэнне, значыць, нехта грошы падкідвае. Для даведкі: штаб-кватэра Міжнароднага паралімпійскага камітэта знаходзіцца ў Боне на тэрыторыі Вышэйшага пасольства ЗША.

Пакуль мы чакаем, што дасць наша апеляцыя ў трыбунал МПК. Затым, магчыма, прымем рашэнне аб падачы іску ў суд Германіі па месцы знаходжання МПК. Нямецкія адвакаты, якія займаюцца спартыўнымі арбітражнымі справамі, кажуць, што ў нас высокая верагоднасць перамогі.

— Як у гэтых умовах адчуваюць сябе спартсмены?

— Яны трэніруюцца, ніхто не апусціў рукі. Спорт — сэнс іх жыцця. Яны праз спорт даказваюць, што паўнавартасныя члены грамадства, запатрабаваныя, паспяховыя. Таму матывацыі ў іх хапае. У нас расце моцная перспектыўная моладзь. Цяпер можам спакойна прайсці змену пакаленняў у нацыянальных камандах, узмацніць іх. Мы супастаўляем вынікі, якія нашы спартсмены паказваюць, з вынікамі міжнародных стартаў. На адкрытым чэмпіянаце Беларусі па плаванні нашы спартсмены ўстанавілі шэсць сусветных рэкордаў. Гэта яркае сведчанне таму, што сусветны паралімпійскі рух сапраўды многае згубіў ад нашай ізаляцыі.

— Але ў зімовых відах ужо другі сезон праходзіць без міжнародных стартаў. Для спартсменаў гэта адчувальна...

— Я сустракаўся з міністрам спорту Расіі Алегам Матыцыным, прэзідэнтам Паралімпійскага камітэта Расіі Паўлам Ражковым. Мы выпрацавалі кірункі, па якіх будзем працаваць. Ужо вярстаецца каляндар сумесных спаборніцтваў Беларусі і Расіі. Найбліжэйшы турнір па лыжных гонках і біятлоне ў люты прыме Беларусь. Плануем яго правесці ў Мінску ці ў Лагойску. Магчыма, матывацыя спартсменаў будзе не такой як, напрыклад, на чэмпіянаце свету. Але гэты перыяд трэба перажыць. У рэшце рэшт любая вайна заканчваецца мірам.

— Для правядзення турніраў патрэбна безбар'ернае асяроддзе. У якім стане яно на нашых спартыўных аб'ектах?

— У тых жа Раўбічах нядрэнныя ўмовы. Не скажу, што ўсё ідэальна, але паралімпійцам там зручна. У Брэсце выдатны басейн з гасцінічным комплексам, кафэ. Адзіны невялікі недахоп — не хапае ліфту, каб спартсмен мог з кафэ перайсці ў спартыўны комплекс. Але губернатар Брэсцкай вобласці Юрый Вітольдавіч Шулейка запэўніў, што сёлета гэта праблема будзе вырашана. Калі прыязджалі расійскія спартсмены, асабліва з невялікіх гарадоў, захапляліся тым узроўнем універсальнага асяроддзя, што ёсць у Беларусі, пачынаючы з аэрапорта і чыгуначнага вакзала.

— Які ўдзел у стварэнні безбар'ернага асяроддзя бярэ Нацыянальны паралімпійскі камітэт?

— У гэтай справе актыўны ўдзел прымае грамадскае аб'яднанне інвалідаў. Створаны межведамасны савет па правах інвалідаў пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі. Раз на квартал мы збіраемся ў пэўным рэгіёне і абмяркоўваем найбольш актуальныя праблемы, у тым ліку і безбар'ернае асяроддзе. Адно з самых важных дасягненняў — у будаўнічае заканадаўства ўключаны нормы, якія патрабуюць каб толькі пабудаваныя аб'екты ці адрэстаўрыраваныя абавязкова былі з універсальным асяроддзем. Праект ні аднаго жылога дома, ні аднаго спартыўнага, медыцынскага, культурнага і іншага аб'екта не будзе зацверджаны, калі там не будзе створана стопрацэнтнае ўніверсальнае асяроддзе. Апошні з такіх станоўчых прыкладаў — новая паліклініка ў Гомелі, дзе створаны выдатныя ўмовы, каб кожны чалавек адчуваў сябе камфортна.

— Нягледзячы ні на што, паралімпійскаму спорту патрэбен рэзерв. Ці дастаткова якасна ў краіне працуюць секцыі для дзяцей з інваліднасцю?

— Мы ўдзяляем гэтай рабоце асаблівую ўвагу. Нашы спартсмены рэгулярна праводзяць майстар-класы, каб дзеці разумелі нюансы паралімпійскага спорту. У мінскай школе № 12 адкрыты музей паралімпійскай славы. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях трэнеры ўжо самі шукаюць дзяцей-інвалідаў, каб з імі працаваць. Не заўсёды бацькі разумеюць, як гэта важна для дзіцяці, некаторыя баяцца, што спорт можа нашкодзіць. Але пасля выступлення нашых спартсменаў на буйных стартах колькасць дзяцей і падлеткаў з інваліднасцю ў спартыўных секцыях узрастае. У Бабруйску працуе адпаведная секцыя па плаванні, у Магілёўскай спартыўнай школе прафсаюзаў «Спартак» дзейнічае аддзяленне па лыжах для паралімпійцаў. У Гомелі ёсць цэнтр паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відаў спорту са сваёй нядрэннай базай. Наша лёгкаатлетка Ганна Канюк трэніруе дзяцей у Гродне, а ў Маладзечне — Ігар Фартунаў. У Віцебску трэнер Алег Кірылаў арганізаваў групу па міні-футболе для невідушчых. Мы імкнёмся, каб ва ўчылішчах алімпійскага рэзерву былі інтэграваныя групы, дзе, спартсмены-паралімпійцы вучыліся б разам са здаровымі. Гэта дасць ім больш магчымасцяў для, росту. Пакуль заканадаўчыя нормы такой магчымасці не даюць. Але гэта пытанне жадання кіраўнікоў. Не трэба мяняць заканадаўства — трэба проста адрэгаваць статут. Кіраўнікі спасылаюцца на адсутнасць безбар'ернага асяроддзя, але мы плануем накіроўваць туды спартсменаў, каму яно менш патрэбнае. Пакуль гэта пытанне не вырашаецца. А гэта сапраўды важна. Па сабе ведаю, што такі падыход заўсёды дае вынік. Па-першае, паралімпіец цягнецца за спартсменамі, якія ў нечым мацнейшыя, і такім чынам павышае сваё спартыўнае майстэрства. А па-другое, калі спачатку да паралімпійцаў ёсць пэўная насцярожанасць, то потым яны становяцца сябрамі. Гэта і ёсць інтэграцыя інваліда ў грамадства.

— З дзецьмі зразумела, а як у сённяшніх умовах захаваць матывацыю і патэнцыял маладых спартсменаў, якім прыйшоў час паказваць высокія вынікі?

— Думаю, у маладых спартсменаў нават больш матывацыі, чым у вопытных і вядомых. Зараз у іх ёсць магчымасць часцей выязджаць на спаборніцтвы. Калі раней фінансаванне было накіравана ў асноўным на вядучых спартсменаў, то сёння мы можам дазволіць сабе вывозіць на спаборніцтвы больш моладзі. Падтрымліваем маладых спартсменаў матэрыяльна. Летась паралімпійцы атрымалі 22 стыпендыі ад Мінскага гарвыканкама і пяць стыпендый ад кіраўніцтва іншых рэгіёнаў. Сёлета нашым спартсменам прысуджаны 24 стыпендыі ад рэгіёнаў, за выключэннем Мінска. То-бок нашых спартсменаў усё актыўней падтрымліваюць рэгіёны. Наладжаны цудоўныя сувязі з Прэзідэнцкім спартыўным клубам. Усе нашы просьбы знаходзяць падтрымку. Сёлета 11 нашых спартсменаў — стыпендыяты Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Скардзіцца не даводзіцца. У свой час для мяне найлепшай матывацыяй былі дадатковыя 200 грамаў смятаны, а сёння — і стыпендыі, і інвентар, і зборы, і спаборніцтвы.

— Калі чалавек з інваліднасцю не хоча будаваць спартыўную кар'еру, дзе яшчэ ён можа знайсці сваё прызнанне?

— На прадпрыемствах Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. У нас 18 прадпрыемстваў разам з філіяламі: ва ўсіх абласных гарадах, а таксама ў Полацку, Оршы, Бабруйску, Мазыры, Пінску, Навагрудку, Слуцку, Маладзечне, Чэрвене, Барысаве. На прадпрыемстве працуе каля шасці тысяч чалавек. Беларусь — адзіная краіна на постсавецкай прасторы, якая захавала прадпрыемствы, дзе могуць працаваць інваліды па зроку. Сёння мы можам працаўладкаваць любога інваліда па зроку, і калі ён адзіноклі і яму гэта трэба, выдзеліць месца ў інтэрнаце. Вядома, апошнія падзеі адбіліся і на нас — мы страцілі амаль 30 працэнтаў рынку (Украіна, Прыбалтыка, Польшча, Малдова, Румынія).

Гэта адчувальна, бо 60 працэнтаў сваёй прадукцыі мы экспартуем. Але апускаць рукі не ў нашых правілах, таму шукаем новыя рынкі збыту, выпускаем новую прадукцыю. Усяго нашы прадпрыемствы выпускаюць больш за чатыры з паловай тысячы відаў прадукцыі. Самыя пазнавальныя — трыбуны на стадыёне «Дынама», «Мінск-Арэне», Барысаў-Арэне» і іншых буйных спартыўных пляцоўках. Мы забяспечваем асвятленне вуліц у многіх гарадах, супрацоўнічаем з вядучымі прамысловымі прадпрыемствамі. Работы хапае ўсім.

Аднак галоўная задача нашых прадпрыемстваў — не толькі вытворчасць прадукцыі, але і сацыяльная адаптацыя невідушчых і слабавідушчых. І для гэтага шмат робіцца. На прадпрыемстве працуюць рэабілітолагі, інструктары па спорце, дзейнічае больш за 150 гурткоў па інтарэсах. 14 калектываў мастацкай самадзейнасці маюць званне народнага. Гэта, вядома, затратна: касцюмы, рэпетыцыі, паездкі і гэтак далей. Але мы разумеем, што ўсё для таго, каб чалавек мог працаваць і развівацца ў розных кірунках.

— Алег Аляксандравіч, у вашай біяграфіі шмат цікавых старонак. Але, бадай, ці не самы цікавы факт, што вы скончылі Інстытут культуры. Чаму мянавіта яго?

— Калі прыйшоў час паступаць у інстытут, я ўжо быў майстрам спорту і мог без экзаменаў паступіць у інстытут фізкультуры. У мой час была такая паказка: «Калі няма розуму, паступай у «пед», калі няма культуры — у «мед», а калі ні розуму, ні культуры — у інстытут фізкультуры». А я проста ўзяў даведнік і, куды тыцнуў пальцам, туды і вырашыў падаваць дакументы. Так і трапіў у інстытут культуры. І не шкадую ні кроплі: на маёй рэжысёрскай спецыяльнасці былі выкладчыкі ад бога. Што такое рэжысёр? Гэта чалавек, які ўмее кіраваць людзьмі, арганізоўваць іх работу. Гэта важны навык у любой сферы дзейнасці. Галоўнае — напісаць сцэнарый, сабраць калектыў, зарадзіць яго ідэяй і не перашкаджаць камандзе працаваць. І мне тое вельмі дапамагае.

— Вы чалавек, які бачыў станаўленне паралімпійскага руху ў нашай краіне. Зразумела, што за 30 гадоў усё карэнным чынам змянілася. А як пачыналася?

— У мой час умоў для паралімпійцаў было на парадак менш, чым цяпер. Спартсмены працавалі ў імя энтузіязму і патрыятызму, гэта было вельмі важнае паняцце. Потым спорт стаў крыху прыносіць грошы. І, чаго хаваць, мы самі іх зараблялі. Многія савецкія спартсмены за мяжу везлі савецкую прадукцыю, адтуль — замежную тэхніку і нядрэнна на гэтым зарабляліі. Мой самы вялікі «ўлоў» — у Японіі электрасамавар абмяняў на магнітафон, які потым прадаў за 1200 рублёў (за тыя грошы можна было купіць тры спальныя гарнітуры). Сёння гэта можа падацца дзікім, але тады падтрымка спартсменаў была далёка не такая, як цяпер, таму прыходзілася круціцца самастойна.

— У пачатку года вас перабралі на пасаду старшыні Нацыянальнага паралімпійскага камітэта. Алег Аляксандравіч, якія мэты ставіце перад сабой на наступныя чатыры гады?

— Нашы мэты нязменныя і заўсёды важныя — працаваць над удасканаленнем заканадаўства, якое рэгламентуе паралімпійскі спорт, паляпшаць умовы для нашых спарстменаў. І, вядома, дабівацца вяртання на міжнародную арэну, дзе нашы спартсмены, я ўпэўнены, будуць паказваць яшчэ лепшыя вынікі.

Спорт-тайм

АД РАЎБІЧ ДА МЕЛЬБУРНА

Мінулы тыдзень напоўнены перамогамі беларускіх спартсменаў. Расказваем асноўныя з іх

ПЕРАМОГА ТЫДНЯ. Арына Сабаленка ўпершыню ў кар'еры заваявала тытул «Вялікага шлема». Беларуская тэнісістка стала пераможцай Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі, з перамогай яе павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У гісторыі айчыннага тэніса такога поспеху дасягала толькі Вікторыя Азаранка, якая ў Мельбурне перамагала ў 2012 і 2013 гадах. У фінале Australian Open Арына Сабаленка сустрэлася з прадстаўніцай Казахстана Аленай Рыбакінай. Вынік сустрэчы — 4:6, 6:3, 6:4.

Арына адзначыла, што яе саперніца Алена Рыбакіна гуляла вельмі добра, выйграла першы сэт, і потым з ёй было вельмі цяжка змагацца. «Я не ведаю, што цяпер сказаць, проста вельмі шчаслівая, што заваявала першы такі трафей. Вельмі хачу хутчэй вярнуцца дадому і паказаць гэты аўстралійскі прыз сваім родным — маме і бабулі. Дзякуй вялікі ўсім, хто мяне падтрымліваў і хварэў за мяне!» — сказала яна. Перад стартам турніру ў Аўстраліі беларуска займала пяты радок у сусветным рэйтынгу. Перамога ў Мельбурне падняла яе на другую пазіцыю, забяспечыўшы ў актыве 6100 балаў. Паўфіналістка цяперашняга аўстралійскага першынства Вікторыя Азаранка перамясцілася з 24-й на 16-ю пазіцыю (2138 балаў). Яшчэ адна беларуска Аляксандра Сасновіч займае 37-е месца (1291).

У мужчынскім фінале Australian Open трафей заваяваў сербскі тэнісіст Новак Джокавіч, які абыграў грэка Стэфанаса Ціцыпаса — 6:3, 7:6 (7:4), 7:6 (7:5). Для 35-гадовага Новака Джокавіча гэта дзясятая вікторыя на кортах «Мельбурн-Парка». Цяпер у яго паслужным спісе 22 чэмпіёнскія тытулы на турнірах серыі «Вялікага шлема».

ТУРНІР ТЫДНЯ. У Раўбічах прайшоў пяты этап міжнародных спаборніцтваў па біятлоне «Кубак Садружнасці». Лідар агульнага заліку беларус Антон Смольскі ў мужчынскай спрынтарскай гонцы заняў трэцяе месца. А ў пасьюце Антон Смольскі размясціўся на другой пазіцыі. Беларус таксама стаў бронзавым прызёрам масстарту.

Лідар жаночага агульнага заліку беларуска Дзінара Алімбекава-Смольская стала другой у спрынце. А ў гонцы перасьледу стала пераможцай. Гэта ўмацавала яе пазіцыі ўверсе агульнага заліку Кубка Садружнасці.

ЦЫТАТА ТЫДНЯ. «Адхіленне спартсменаў з-за іх пашпарта не адпавядае каштоўнасцям і місіі Алімпійскай хартыі. Магчыма, расійскія і беларускія спартсмены маглі б спаборнічаць пад нейтральным сцягам на Алімпійскіх гульнях 2024 года ў Парыжы», — цытуе прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта Томаса Баха Spiegel.

На мінулым тыдні Алімпійскі савет Азіі (АСА) прапанаваў Беларусі і Расіі ўзяць удзел у Азіяцкіх гульнях. Турнір пройдзе з 23 верасня да 8 кастрычніка 2023 года ў кітайскім Ханчжоў. У некаторых відах спорту там будуць разыграны алімпійскія ліцэнзіі. У Алімпійскім савеце Азіі адзначылі, што вераць у аб'яднаўчую сілу спорту і ў тое, што ўсе спартсмены павінны мець магчымасць удзельнічаць у спаборніцтвах незалежна ад іх пашпарта. Як паведамляе газета The Indian Express, у выпадку ўдзелу беларускіх і расійскіх спартсменаў у Азіяцкіх гульнях для іх будзе створана спецыяльная сістэма адбору на Алімпіяду-2024 у Парыжы. Паводле слоў выконваючага абавязкі прэзідэнта Алімпійскага савета Азіі Рандхіра Сінгха, беларусы і расіяне не перашкодзяць азіяцкім атлетам размяркоўваць узнагароды і пуцёўкі на Алімпійскія гульні. Плануецца, што МАК сумесна з міжнароднымі спартыўнымі федэрацыямі вызначыць спецыяльную сістэму для беларусаў і расіян, каб і ў іх на Азіяцкіх гульнях была магчымасць кваліфікавацца на парыжскую Алімпіяду.

Фота з адкрытых крыніц.

Кузня чэмпіёнаў

«Яны ахвяравалі дзяцінствам дзеля баскетбола»

Юныя спартсмены гатовыя да барацьбы

Міжнародны бан і палітычныя інтрыгі, ад якіх апошнім часам хістае вялікі спорт, не перашкаджаюць развіццю спартыўнага рэзерву. Крызіс калісьці скончыцца, і трэба сустрэць гэты час моцнымі і падрыхтаванымі. Юныя баскетбалісты ўзялі ўдзел у паўфінале міжрэгіянальнага турніру па баскетболе «Кубак Фенікса» сярод камандаў юнакоў 2008 года нараджэння.

Нашу краіну прадстаўляла юнацкая зборная 2009 года нараджэння, гульцы якой вучацца ў Рэспубліканскім дзяржаўным вучылішчы алімпійскага рэзерву (РДВАР). Адмыслова для набыцця гульнявой практыкі трэнерскі штаб заявіў каманду ў старшую ўзроставую групу. Спецыялісты ўпэўненыя, што гэта пойдзе на карысць юным гульцам: у канкурэнцыі з дарослымі і больш вопытнымі сапернікамі павышаецца спартыўнае майстэрства. Для юнакоў сёння гэта самае галоўнае. У паўфінале турніру беларусы занялі чацвёртае месца. Аднак тут няма нагоды для суму. «Кубак Фенікса» — той самы выпадак, калі галоўнае — не перамога, а ўдзел.

Адкрыты міжрэгіянальны турнір па баскетболе «Кубак Фенікса» праводзіцца сярод юнакоў і дзяўчат ва ўзроставых катэгорыях ад 10 да 14 гадоў. У спаборніцтвах удзельнічаюць 180 камандаў з 38 гарадоў Расіі і Беларусі. «На першы погляд, беларуская і расійская школа баскетбола падобныя. Але ўсё ж такі ў расійскіх камандаў ёсць свае асаблівасці і падыходы. І нашым камандам будзе карысна пра тое даведацца. Гэтыя баскетбалісты ў будучыні ўвойдуць у склад нацыянальных зборных, і вельмі важна, каб у іх было як мага больш спаборніцкай практыкі», — адзначыла **генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола Настасся МАРЫНІНА.**

У спорце, як і ў звычайным жыцці, вучацца на сваіх памылках. Таму маладым гульцам часам карысна памыліцца. Адмоўны вопыт — таксама вопыт. І такія турніры, як «Кубак Фенікса», дазваляюць набыць патрэбныя веды і навыкі.

«Наша мэта — падрыхтоўка рэзерву для нацыянальнай каманды. Мы працуем над развіццём індывідуальнай тэхнікі і індывідуальнай тактыкі. Індывідуальная тэхніка — тое, што яны ўмеюць рабіць з мячом, а індывідуальная тактыка — разуменне гульні. Вельмі важна не ўпусціць спартсмена ў 13-14 гадоў. У гэтым узросце яны праходзяць вельмі сур'ёзную школу падрыхтоўкі, прывыкаюць да дысцыпліны. Пачынаюць задумвацца над будучыняй, усведамляюць, ці хочуць рэалізаваць сябе як спартсмены альбо лепш абраць нешта іншае. Але, на шчасце, усе, хто сабраны ў гэтай камандзе, мараць аб высокім, ставяць вялікія мэты і ідуць да іх кожны дзень», — адзначае **Аляксей СЯЛЕНЯ, старшы трэнер мужчынскай каманды па баскетболе U-14.** Па словах трэнера, графік у каманды насычаны, гульнявой практыкі хапае: «У нашай краіне шмат камандаў старэйшага ўзросту, з якімі мы можам сапернічаць. Так, мы не заўсёды іх перамагаем, але галоўнае — атрымаць гульнявы досвед. Хлопцам карысна праводзіць матчы, дзе яны могуць уступіць дваццаць балаў і ўбачыць свае слабыя бакі. Патрэбныя матчы, дзе яны выйграюць два балы, каб убачылі, што такое барацьба да апошняга. Таму «Кубак Фенікса» для нас — выдатная магчымасць атрымаць гульнявую практыку, сустрэцца з добра падрыхтаванымі камандамі. Хлопцам вельмі карысна ўбачыць розныя школы падрыхтоўкі. У нас, напрыклад, не прынята гуляць зонавыя абароны, мы гуляем асабіста і ўсё прыкладна адно і тое ж у абароне. А сустракаючыся з рознымі камандамі, бачыш разнастайнасць трэнерскай думкі ў абароне і нападзенні. Сёння гуляеш супраць асабістай абароны, заўтра — супраць зонавай абароны, потым гуляеш супраць зонавага прэсінгу — і ўсяму вучышся», — дзеліцца Аляксей Сяленя.

Алімпійская кроў

Сваю каманду трэнер называе ўнікальнай. Нягледзячы на юны ўзрост, хлопцы паводзяць сябе як дарослыя адказныя спартсмены. Прыклад усёй камандзе задае **капітан Сямён ГУРАЛЬ.** «Графік у каманды сур'ёзны: па дзве трэніроўкі на дзень, яшчэ трэба вучыцца ў школе. Але кожны хлопец разумее, дзеля чаго тое трэба. Яны ўсе з'ехалі з дому, ахвяравалі сваім дзяцінствам, адмовіліся ад гурткоў, дзіцячых забавак. Нягледзячы на ўзрост, гэта дарослыя людзі», — расказвае ён.

«Разыначка» каманды U-14 і ў тым, што ў ёй прысутнічае алімпійская кроў. Іван Багдановіч — сын алімпійскага чэмпіёна 2008 года па веславанні на байдарках і каноэ Аляксандра Багдановіча. Аляксей Сяленя адзначае, што Багдановіч-малодшы — фізічна моцны хлопец з характарам пераможца. Захар Барбашынскі — малодшы сын алімпійскага чэмпіёна 1992 года, гандбаліста Андрэя Барбашынскага. Цікава, што калісьці баскетбольную будучыню прадракалі і самому Андрэю Барбашынскаму, але перамог гандбол. А вось нашчадак, па словах Андрэя Станіслававіча, цвёрда і ўпэўнена абраў баскетбол. «Усе кажуць, што мы з Захарам — копія адзін аднаго. Спецыялісты адзначаюць, што ён добра арыентуецца на пляцоўцы. Ім усім сёння не хапае моцы, агульнай фізічнай падрыхтоўкі, але тое можна выправіць. Самае галоўнае, што ў Захара ёсць мэта, мэтанакіраванасць, жаданне — дзякуй генам. У мяне ў яго ўзросце таксама былі мэта і жаданне дасягнуць яе. Захар уважліва ставіцца да заняткаў спортам, не ўхіляецца, трэніруецца па два разы на дзень. Жадання ў яго не адабраць, і мы як бацькі гэта толькі падтрымліваем», — дзеліцца Андрэй Барбашынскі. Алімпійскі чэмпіён падкрэсліў, што цяпер у хлопцаў адказны ўзрост — ім трэба пацвердзіць сваё ўменне і жаданне займацца спортам, максімальна праявіць сябе. Няпроста. Але ж ніхто не гарантаваў, што ў вучылішчы алімпійскага рэзерву будзе лёгка. Андрэй Барбашынскі ведае пра тое як ніхто іншы, таму і ўсяк падтрымлівае сына.

Па выніках першага тура «Кубка Фенікса» найлепшым гульцом РДВАР быў прызнаны Яраслаў Гесць, малодшы брат «галоўнага чэмпіёна беларускага баскетбола» Рамана Гесця. Раман таксама прайшоў вучылішча алімпійскага рэзерву, выступаў за клуб «Мінск», абараняў гонар краіны на чэмпіянатах Еўропы. А летась перамог страшную хваробу і вярнуўся ў родны клуб у якасці трэнера. «Думаю, у Яраслава ёсць будучыня ў баскетболе. Калі яму пашанцуе і ён вырасце хоць бы да 195 сантыметраў, будзе выдатны гулец для зборнай Беларусі. Ён жыве баскетболам, як і я. Мне падабаецца, як брат працуе, ён выкладваецца на максімум. Апроч трэніровак, пастаянна глядзіць розныя матчы, ролікі — актыўна цікавіцца баскетболам. Мне імпануе такі падыход», — дзеліцца Раман.

Няхай «Кубак Фенікса» не сабраў тысячы аматараў, няма сумненняў, што юныя баскетбалісты яшчэ будуць выступаць перад поўнымі трыбунамі. А пакуль яны крок за крокам, турнір за турнірам ідуць да мэты. І самае галоўнае для іх — вера і падтрымка. Наперад, хлопцы!

Фота Беларускай федэрацыі баскетбола.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

ПЛЕЩЕНИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
сообщает о проведении 3 марта 2023 г. открытого аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенного незаконсервированного капитального строения в г. п. Плещеницы Логойского района Минской области

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
Аукцион по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенного незаконсервированного капитального строения						
1	**Минская область, Логойский район, г. п. Плещеницы, ул. Высокая, 1,** земельный участок с кадастровым номером 623255700001002203, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома и незавершенное незаконсервированное капитальное строение (не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом)	0,0960	Возможность подключения к электроэнергии, водоснабжению	9 500,00	*Публикация в газете + 228,17 руб.*	950,00
